Рэндзі Алкорн



# ЗА ЖЫЦЦЁ!

## Як дапамагчы ненароджаным дзецям і іх мамам?

РЭНДЗІ АЛКОРН

# ЗА ЖЫЦЦЁ!

## ЯК ДАПАМАГЧЫ НЕНАРОДЖАНЫМ ДЗЕЦЯМ І ІХ МАМАМ?

Пераклад з англійскай

Дабравест
CLC Беларусь

Брэст
Хрысціянскае місіянерскае таварыства «Благавест»
Саюза ЕХБ у Рэспубліцы Беларусь
2013

УДК 277.4-423.57:618.39
ББК 86.376
А 45

Alcorn Randy
Why Pro-Life?
Caring for the Unborn and Their Mothers

Hendrickson Publishers Marketing, LLC
P.O. Box 3473
Peabody, Massachusetts 01961-3473
USA

Used by permission.

**Алкорн, Рэндзі**

А 45 **За жыццё!** : Як дапамагчы ненароджаным дзецям і іх мамам? : пер. з англ. / Рэндзі Алкорн. – Брэст : Хрысціян. міссіянер. т-ва «Благавест» Саюза ЕХБ у Рэсп. Беларусь, 2013. – 120 с.

ISBN 978-985-6853-23-7.

Праблема абортаў – вельмі актуальная ў наш час. Рэндзі Алкорн перакананы, што абарона чалавечага жыцця ад моманту зачацця з'яўляецца адзінай правільнай пазіцыяй. Рознабакова разглядаючы праблему, аўтар прыводзіць пераканаўчыя аргументы на карысць поглядаў "за жыццё".

**УДК 821.161.3-32**
**ББК 84(4Беи)-44**

ISBN 978-985-6853-23-7

© 2004 by Hendrickson Publishers Marketing, LLC
© Рэлігійная місія «Хрысціянскае місіянерскае таварыства "Благавест"» Саюза евангельскіх хрысціян баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь, 2013

Кніга Рэндзі Алкорна – гэта лаканічнае і ўсебаковае прадстаўленне пазіцыі “за жыццё”. Яна з’яўляецца каштоўным рэсурсам для актывістаў “за жыццё”, якія маюць шчырае сэрца, але якім часам бракуе слоў.

*Фрэдэрыка Мэцьюс-Грын, калумністка, каментатар і аўтар кнігі “Сапраўдны выбар: слухаць жанчын і шукаць альтэрнатыву абортам”.*

Гэта выдатная кніга дашчэнту разбівае стэрэатыпы; яна дапаможа ацаліць раны найбольш надзённага ўнутранага канфлікту Амерыкі.

*Рабі Даніэль Лапін, старшыня арганізацыі “Да традыцыі”, нацыянальнай кааліцыі юдэяў і хрысціянаў, пісьменнік, госць радыё ток-шоу.*

Захапляльнае даследаванне адной з найбольш важных праблем нашага пакалення. Не мог адарвацца ад чытання!

*Эндзі Стэнлі, Супольная царква Норз-Поінт, Альпарэта, штат Джорджыя*

Тут усе доказы, якія толькі могуць спатрэбіцца. У гэтай маленькай кнізе сцісла змешчаныя сутнасныя адказы на найбольш папулярныя аргументы руху “За выбар”. Рэндзі Алкорн прапаноўвае магутны напамін, што ўсе створаныя істоты заслугоўваюць годнасці, свабоды і роўных правоў. Я веру, што гэтая кніга мае здольнасць расплюшчыць вочы і змяніць сэрцы мільёнаў людзей. Моцная кніга, якую вы захочаце даць пачытаць усім вашым знаёмым.

*Нэнсі Стэфард, акторка і аўтар кніг “Цуд Ягонай любові” і “Прыгажосць у Кнізе”.*

“Для таго, каб змяніць нашу культуру, недастаткова проста казаць, што мы “за жыццё”; мы павінны растлумачыць, чаму мы “за жыццё”. Дадзеная кніга – цудоўны дапаможнік у гэтай справе.”

*Айцец Фрэнк Павон, нацыянальны дырэктар арганізацыі “Святары за жыццё”, старшыня “Нацыянальнай рэлігійнай рады “За жыццё”*

Прадуманы і вычарпальны аналіз пытання “чаму абарона чалавечага жыцця з’яўляецца не толькі адзінай правільнай, але, у прынцыпе, адзінай пазіцыяй, якой нам як грамадзянам варта прытрымлівацца. Я думаю, гэтая кніга пераменіць мысленне чытачоў.

*Крыстэн Дэй, выканаўчы дырэктар “Дэмакраты за жыццё Амерыкі”*

“За жыццё” – каштоўнейшая крыніца для любога, хто намагаецца дапамагчы блізкім людзям зразумець погляды “за жыццё”. Простай захапляльнай мовай Рэндзі Алькорн выкладае праблему, адначасова выкарыстоўваючы і сілу розуму, і сілу пачуццяў.

*Чарльз Колсан, “Асацыяцыя вязняў”, Вашынгтон*

Зразумелая, заснаваная на фактах і у той жа час захапляльная кніга; яна асабліва кранае дзякуючы таму, што тычыцца дзетак, якія знаходзяцца ў небяспецы.

*Джэніфер О’Ніл, акторка, аўтар і прэсавы сакратар кампаніі “Папярэджанне пра немагчымасць больш маўчаць”*

# Пра аўтара

Рэндзі Алкорн – даследчык, аўтар 27 кніг-бэстсэлераў. Спіс яго публіцыстычных кніг уключае творы “Парадокс ласкі і ісціны”, “Прынцып скарбу”, “Адказы «за жыццё» на аргументы «за выбар»”, “Нябёсы”. Сярод яго мастацкіх твораў апавяданні “Ля апошняй мяжы”, “Валадарства”, “Падман”, “Замова Каналіса” і кніга, якая атрымала “Залаты медаль”* – “Вяртанне дамоў”. У Рэндзі ёсць дзве дачкі, якія ўжо замужам – Карына Франклін і Анжэла Стамп. Рэндзі Алкорн жыве ў Грэшаме, штат Арыгон, разам са сваёй жонкай Нэнсі, якая таксама з'яўляецца яго лепшым сябрам. Яны маюць чатырох унукаў. Арганізацыя, у якой служыць Рэндзі, называецца “Служэнні з пагляду вечнасці” (Eternal Perspective Ministries). З ёй можна звязацца праз сайт www.epm.org і электронную пошту info@epm.org.

* Штогадовая прэмія Асацыяцыі выдаўцоў евангельскіх хрысціян (заўв. перакладчыка)

# Іншыя кнігі Рэндзі Алкорна

**Мастацкія:**
*“Ля апошняй мяжы”,*
*“Валадарства”,*
*“Падман”,*
*“Замова Каналіса”,*
*“Мяжа вечнасці”,*
*“Лісты выскалякі”,*
*“Вяртанне дамоў”,*
*“Дачакацца таго дня”,*
*“Распавядзі мне пра нябёсы”.*

**Публіцыстычныя:**
*“У святле вечнасці”,*
*“Грошы, маёмасць і вечнасць”,*
*“Закон узнагароды”,*
*“Адказы «за жыццё» на аргументы «за выбар»”*
*“Аднаўляючы сэксуальную чысціню”,*
*“Сэксуальныя спакусы”,*
*“Парадокс ласкі і ісціны”,*
*“Прынцып чысціні”,*
*“Прынцып скарбу”,*
*“Жанчына ў стрэсе”,*
*“Нябёсы”,*
*“50 дзён нябёсаў”,*
*“Нябёсы для дзетак”.*

*Адры Стаўт, якая клапоціцца пра ненароджанных і іх мацярэй і якая клапацілася пра маю маму, калі яна памірала ад раку ў 1981г.*

*Твае добрыя справы не будуць забытыя Богам, які ўзнагароджвае кожны кубак халоднай вады, пададзены ў Ягонае імя.*

## Падзякі:

*Майму рэдактару і каштоўнаму сябру Робу Морысу за яго далікатныя дапрацоўкі; Кэці Рэмі, якая зрабіла цудоўную працу, скарацiўшы першапачатковы рукапіс; таксама Боні Хістанд, якая набрала некаторыя з апошніх зменаў, унесеныя у машынапісны тэкст. Дзякуй Брайну Сміту, Брэнту Руні, Крысціне Коўлтэр, Кімберлі Броку і Брайну Томасану за іх дапамогу ў гэтым праекце; Дагу Габерту за яго натхненне. Дзякуй маёй жонцы Нэнсі, Рону і Кэці Норквістам, Джэнэт Алберс, Ліндзе Джэфрыс і Шэран Мізенхаймер. Я сапраўды вельмі цаню кожнага з вас за вашую каштоўную дапамогу. Вялікі дзякуй Гэйлу Атэбэры, Лары Гэдбаху і Алісе Грэй, якія зрабілі вельмі важны ўнёсак у мае першыя чарнавікі.*

# Частка 1

# АСНОВЫ



ГЛАВА 1

# НАВОШТА РАЗМАЎЛЯЦЬ ПРА АБОРТЫ?

Прадстаўнік Нацыянальнай лігі дзеянняў у падтрымку права на аборт (NARAL Pro-Choice America) распавядаў у сярэдняй школе пра вартасці абортаў. Адзін вучань запытаўся, ці можна прыйсці мне, каб распавесці пра пазіцыю "за жыццё". Калі праз тыдзень я прыйшоў у гэтую школу, настаўнік сказаў мне, што вучні прагаласавалі 23:1 на карысць пазіцыі "за выбар".

Я распавёў класу пра чалавечую прыроду і правы ненароджаных дзетак. Я паказаў фотаздымкі развіцця ненароджанага дзіцяці на ранніх тэрмінах, калі звычайна робяцца аборты.

Пасля занятку настаўнік сказаў: "Калі б зараз зноўку прагаласавалі, думаю, вынік быў бы іншым. Мысленне перамянілася." А потым ён дадаў нешта вельмі важнае: "Ведаеце, да гэтага дня я ніколі не чуў пазіцыі "за жыццё".

Мы вельмі ганарымся тым, што ў нас шырокія погляды, што мы прапануем сумленную, арыентаваную на факты адукацыю. Пры гэтым, пяцідзесяцігадовы настаўнік гуманітарных прадметаў са ступенню магістра *ніколі не чуў пазіцыі "за жыццё".* Ён некрытычна прыняў пазіцыю "за выбар" ад іншых; тое самае зрабілі і ягоныя вучні.

## Дзіўная тэндэнцыя

Самы высокі паказчык падлеткавых цяжарнасцяў і абортаў сярод краін Заходняй Еўропы мае Вялікабрытанія[1]. На сайце газеты Telegraph адзін з артыкулаў называецца "Узровень падлеткавых абортаў б'е ўсе рэкорды, як і паказчык цяжарнасцяў да 16 год". У гэтым артыкуле сцвярджаецца, што

ў Аб'яднаным Каралеўстве ў 2007 г. болей за 21 000 дзяўчын да 18 год абралі аборт. Працэнт дзяўчын, якія аддалі перавагу аборту, павысіўся да 50, у параўнанні з 48% у 2006 і 40% у 1996 гадах[2].

Як бы там ні было, а ў Злучаных Штатах назіраецца дзіўная тэндэнцыя. Калісьці падавалася, што пазіцыя "за жыццё" проста памрэ з цягам часу. Было падобна, што маладыя людзі настолькі пагружаныя ў маральны рэлятывізм постмадэрнавай талерантнасці, што яны ўсе, у рэшце рэшт, адзінадушна стануць на пазіцыі "за выбар". Але сёння маладыя людзі выступаюць супраць абортаў у большай ступені, чым іхнія бацькі. Апытанне, праведзенае агенцтвам Гэлапа, паказвае: 72% падлеткаў вераць, што аборт – з'ява маральна няправільная. Толькі 19% лічаць, што ў любых абставінах аборты павінны быць законнымі, у той час як той жа пазіцыі прытрымліваюцца 26% дарослых. Каля 32% падлеткаў (у параўнанні з 17% дарослых) думаюць, што аборты недапушчальныя ані пры якіх абставінах[3]. Гэты факт, пацверджаны на наступных нацыянальных апытаннях[4], таксама падмацоўваецца і колькасцю падлеткаў, якія штогод удзельнічаюць у "Маршы за жыццё"[5]. Шмат сайтаў дасягаюць маладых дзяўчын і заахвочваюць іх абраць жыццё[6]. Мноства маладых людзей не хочуць пагадзіцца з апраўданнем абортаў, навязаным сучаснай культурай.

У кнізе "За жыццё!" я прадстаўлю прычыны, якія будуць апеляваць і да фактаў, і да пачуццяў. Бо менавіта яны, на маё меркаванне, тлумачаць і абгрунтоўваюць гэты зрух ад пазіцыі "за выбар" да пазіцыі "за жыццё".

## Вырашальнае пытанне нашых дзён

Закон аб абортах быў прыняты ў Вялікабрытаніі ў 1967 г. і ўступіў у дзеянне годам пазней. Ён распаўсюджваецца на ўсё Аб'яднанае Каралеўства, за выключэннем Паўночнай Ірландыі. Для жанчын, што жывуць у Англіі і Уэльсе, паказчык

абортаў у 2008 г. склаў 195 296, і параўнальна з 198 499 у 2007 г[7]. скараціўся на 1,6%. 91% абортаў быў прафінансаваны Міністэрствам аховы здароўя. З іх 58% абортаў (г. зн., больш за палову) былі зроблены паводле кантракту з Міністэрствам, але ў незалежных клініках. 91% абортаў былі праведзеныя да 13 тыдняў цяжарнасці, а 73 – на тэрміне да 10 тыдняў. Медычныя аборты склалі 38% ад агульнай колькасці. Таксама 1988 абортаў (1%) былі зробленыя з-за рызыкі нараджэння дзяцей з абмежаванасцямі развіцця. За 2008 год у лякарнях Англіі і Уэльса было зроблена 6862 аборты для асоб, якія не з'яўляюцца рэзідэнтамі (7099 абортаў у 2007 г.).

Фактычна, кожная сям'я ў пэўнай ступені была закранутая абортам. Стаўка ў гэтай праблеме неверагодна высокая. Калі пазіцыя "за выбар" мае рацыю, тады свабода выбраць аборт – фундаментальнае права. Калі ж праўда на баку тых, хто выступае "за жыццё", атрымліваецца, што прыблізна 4000 жыццяў, якія штотыдзень знішчаюцца ў Брытаніі, – чалавечыя ахвяры.

Адно з апытанняў агенцтва Гэлапа паказала, што 26% амерыканцаў перакананна выступаюць "за выбар", у той час як 29% упэўнена выказваюцца "за жыццё". Такім чынам атрымліваецца, што каля 55% амерыканцаў маюць перакананні па праблеме абортаў, і яны падзяляюцца прыблізна на палову[8]. У той жа час, 45% амерыканцаў не маюць грунтоўнага меркавання. Калі ўзгадаць, што нават людзі з глыбокімі перакананнямі змяняюць сваю пазіцыю, то выходзіць, што погляды на аборты больш паловы амерыканцаў можна змяніць.

## Хрысціянскі погляд

Некаторыя з чытачоў-хрысціян могуць падумаць: "Дык гэтая кніга не для нас. Яна для нецаркоўных людзей, якія робяць аборты." У Амерыцы 43% жанчын, што робяць аборты, вызначаюць сябе пратэстанткамі, а 27% - каталічкамі. Дзве

траціны абортаў выпадаюць на долю жанчын, якія лічаць сябе хрысціянкамі. 18% абортаў робяцца жанчынам, якія лічаць сябе адроджанымі або евангельскімі хрысціянамі[9]. Атрымліваецца, што кожны год у ЗША прыблізна чвэрць мільёна абортаў робіцца людзьмі, якія грунтуюцца на Бібліі і ходзяць у царкву.

У Брытаніі мноства пратэстантаў і евангельскіх хрысціян выступаюць супраць абортаў. У Паўночнай Ірландыі каталікі і пратэстанты аб'ядналіся супраць абортаў. Разам з тым, некаторыя дэнамінацыі хутчэй выступаюць за аборты. Англіканская царква сцвярджае, што ненароджанае дзіця – жывое і створанае Богам, а Генеральны Сінод 1993 года заявіў, што "колькасць абортаў, зробленых з моманту прыняцця Закону аб абортах 1967 года, ёсць непрымальна высокай." Але Англіканская царква таксама верыць, што ў некаторых сітуацыях правядзенне аборту можа быць маральна прымальным, напрыклад, калі дзіця пакутуе на сур'ёзнае адхіленне[10].

Праблема абортаў – гэта не тая сфера, дзе царква павінна адрасаваць сваё пасланне да свету. Тут царква павінна, перадусім, звярнуцца да сябе, а ўжо *потым* – да свету.

Нягледзячы на тое, што я з'яўляюся хрысціянінам, у гэтай кнізе я не прыводжу аргументаў з Бібліі. Гэта я зрабіў у іншай кнізе[11]. Праблема, як я яе выкладаю тут, грунтуецца на медычнай навуцы і правераных даследаваннях па псіхалогіі. Гэтыя крыніцы аднолькава аўтарытэтныя што для агностыка, які паважае праўду, што для хрысціяніна. Насамрэч, шматлікія не-хрысціяне таксама супрацьстаяць абортам.

Я веру ў правы жанчын. У мяне найглыбейшая павага да маёй жонкі і маіх дачок. Мы гадавалі іх у пашане да саміх сябе і ва ўдзячнасці Богу, што Ён стварыў іх жанчынамі. Я не хачу праменшыць тую траўму, якую перажывае жанчына, калі праходзіць праз аборт. Ніхто не можа зразумець пакуты настолькі добра, як Ісус Хрыстос, поўны ласкі і праўды. Раздзел, прысве-

чаны пошуку Божага прабачэння (18 раздзел), патрэбны таксама і мне, як і любому іншаму чалавеку.

Гэтая кніга прадстаўляе факты і логіку, прасякнутыя ласкай і спачуваннем, якія дапамогуць нам укараніць нашу веру ў рэальнасці.

## Мая просьба да чытачоў

Калі вы "за выбар" і пры гэтым чытаеце кнігу, якая называецца "За жыццё!", вы – малайцы. Спадзяюся, гэта значыць, што вы адчыненыя для іншых меркаванняў. Калі апынецца, што пазіцыя "за жыццё" сапраўды бессэнсоўная і ірацыянальная, як вам і распавядалі – добра. У такім выпадку вы, прынамсі, атрымаеце пацвярджэнне гэтаму "з першых рук". Але калі вы пабачыце ў ёй сэнс, я заклікаю вас наноў абдумаць вашую пазіцыю.

Калі вы з той вялікай групы людзей, што "сядзяць на плоце" ў ваганнях, прашу вас зрабіць гэтую кнігу часткай вашых пошукаў праўды.

Калі вы "за жыццё", я прашу вас разабрацца да канца з вашай пазіцыяй. Гэта не лепшае перакананне: "Я ведаю, што маю рацыю, але не ўпэўнены, чаму менавіта." Калі мы памыляемся ў нейкім пытанні, неабходна перагледзець нашую пазіцыю. Калі ж мы маем рацыю, неабходна навучыцца разумна і добразычліва дзяліцца гэтым з іншымі.

Адно можна сказаць з упэўненасцю: калі аборт сапраўды забівае дзіця і шкодзіць маці, тады на кон пастаўлена занадта шмат, каб проста стаяць убаку і нічога не рабіць.

## ГЛАВА 2

# ЗА МАЦІ АБО ЗА ДЗІЦЯ?

Мы разам з маёй жонкай далучыліся да працы па абароне жыцця з-за нашага клопату пра жанчын, знішчаных абортам. У 1981 г. мы адчынілі наш дом для цяжарнай дзяўчыны-падлетка. Я служыў у адміністрацыі аднаго з першых цэнтраў дапамогі цяжарным на Заходнім узбярэжжы ЗША. Жанчыны, якім дапамагаў гэты цэнтр, заблыталіся, былі ў патрэбе і адчаі. Нашай мэтай было дапамагаць ім усімі магчымымі сродкамі. І найлепшым шляхам дапамогі такім жанчынам было паказаць альтэрнатыву аборту.

З цягам часу я ўжо быў задзейнічаны ў адукацыйных праектах і палітычных акцыях "за жыццё", а таксама ў мірных негвалтоўных выступленнях перад клінікамі, дзе рабілі аборты. Некаторыя служэнні ў абарону жыцця больш увагі надаюць збаўленню ненароджанага дзіцяці, іншыя – дапамозе цяжарным жанчынам. Я зразумеў, што абодва накірункі жыццёва неабходныя і цалкам сумяшчальныя.

## Рух, які вы, магчыма, і не ведаеце

Вакол руху "за жыццё" створаны незлічоныя міфы. Прывяду адзін прыклад: вельмі часта паўтараецца сцвярджэнне, што людзей, якія выступаюць "за жыццё", не хвалюе лёс цяжарнай жанчыны і самога дзіцяці пасля нараджэння.

Аднойчы тэлевізійны рэпарцёр падышла да мяне на адным з мерапрыемстваў "за жыццё" і папрасіла адказаць на гэтыя абвінавачанні. Я сказаў: "Ведаеце, мы разам з жонкай адчынілі дзверы нашага дома для адной цяжарнай дзяўчыны і аплочвалі ўсе яе выдаткі, пакуль яна жыла з намі. Мы падтрымлівалі яе, калі яна вырашыла аддаць дзіця на ўсынаўлен-

не. І калі вы ўжо запытваеце, мы аддаем значную частку нашых заробкаў на дапамогу бедным жанчынам і дзецям."

Потым я пазнаёміў журналістку з маім сябрам-пастарам, які стаяў побач. Разам з жонкай яны ўсынавілі 19 дзяцей, частка з якіх хварэла на сіндром Даўна або мела іншыя адмысловыя патрэбы. Рэпарцёр падала сігнал аператару, каб ён болей не здымаў. Я запытаўся, ці хоча яна зрабіць інтэрв'ю з маім сябрам. Яна адмоўна пакачала галавой і пайшла далей.

Факт заключаецца ў наступным. Тысячы арганізацыяў "за жыццё" па ўсім свеце бясплатна забяспечваюць тэсты на цяжарнасць, ультрагукавыя даследаванні, кансультацыі, групы падтрымкі, навучальныя заняткі па доглядзе за дзіцём, адукацыю па кіраванні фінансамі, дапамогу нянечак, падгузнікі, дзіцячае адзенне і прытулак. Дадайце да гэтага дзясяткі тысяч цэркваў, якія ахвяруюць час, грошы, ежу, рамантуюць дамы і аказваюць любую іншую дапамогу, неабходную цяжарным жанчынам, самотным маці і бедным сем'ям. Незлічоная колькасць людзей, якія выступаюць "за жыццё", усынаўляюць дзетак, адчыняюць свае дамы і добраахвотна дапамагаюць дзеткам пасля іх нараджэння.

Людзі, якія прапаноўваюць альтэрнатыву абортам, робяць гэта бясплатна, з любоўю і амаль што заўжды незаўважна. Насуперак некаторым карыкатурным выявам, гэтыя людзі не толькі – "за нараджэнне", яны сапраўды – "за жыццё". Яны клапоцяцца і пра дзіця, і пра маці і прыходзяць, каб дапамагчы ім не толькі да нараджэння, але і пасля.

## Шызафрэнія!

Нягледзячы на раскол, які існуе паміж тымі, хто выступае "за выбар" і "за жыццё", дзве траціны амерыканцаў лічаць, што аборты ёсць "з'явай маральна няправільнай"[1]. Некаторыя змагары "за жыццё" робяць з гэтага памылковыя высновы, што болей не трэба тлумачыць, што ненароджанае дзіця

з'яўляецца чалавекам, а аборты – гэта няправільна. Замест гэтага лепш зрабіць акцэнт на тым, каб дапамагчы жанчынам зразумець, што аборты – не ў іх інтарэсах.

Я бясспрэчна згодны, што мы павінны дапамагаць жанчынам з нежаданай цяжарнасцю зразумець, што аборт нанясе ім шкоду, а не дапаможа. Многія жанчыны думаюць, што аборт – гэта няправільна. Разам з тым, яны перакананыя, што аборт – гэта "найменшае зло". Яны лічаць, што гэта ўсё адно лепей, чым выхоўваць дзіця, або нарадзіць дзіця, каб потым аддаць яго на ўсынаўленне[2].

Мы павінны паказаць, што хаця любое вырашэнне жанчыны няпростае, аборт – гэта тое вырашэнне, пры якім забіваецца нявінная асоба. І менавіта з-за гэтага, у рэшце рэшт, такі выбар прынясе найгоршыя наступствы для жыцця жанчыны.

Тым не менш, вялікая частка людзей, перакананых, што ненароджанае дзіця з'яўляецца чалавекам і што аборты амаральныя, выбіраюць аборт і абараняюць законнасць абортаў. Гэта даказвае: яны не вераць, што ненароджанае дзіця з'яўляецца чалавекам у тым жа сэнсе, у якім яны лічаць чалавекам трохгадовае дзіця.

Апытанні таксама паказваюць, што многія людзі, якія лічаць аборты амаральнымі, нягледзячы на гэта вераць, што яны павінны застацца законнымі. Напэўна, будзе справядліва выказаць меркаванне, што гэтыя людзі вераць, што згвалтаванне, выкраданне чалавека, жорсткае абыходжанне з дзецьмі або забойства з'яўляюцца амаральнымі. Але чаму гэтыя людзі не выступаюць за тое, каб згвалтаванне або забойства сталі законнымі? Гэта паказвае сутнаснае адрозненне, якое яны маюць на ўвазе, калі кажуць пра амаральнасць забойства або згвалтавання і пра амаральнасць аборту.

Ніхто з тых, хто лічыць ненароджанае дзіця паўнавартаснай асобай, не можа рацыянальна апраўдваць законнасць абортаў, пры гэтым не абараняючы легальнасці забойства іншага чалавека. У рэшце рэшт, кожны аргумент за аборт, які спасылаецца на нязручнасці для маці, стрэс і фінансавыя цяжкасці, настолькі ж пераканаўчы, наколькі гэтыя аргументы можна

выкарыстаць у дачыненні да дванаццацігадовага дзіця, або мужа ці бацькоў той жа жанчыны. Вельмі часта старэйшыя дзеці абыходзяцца даражэй і высоўваюць больш сур'ёзныя патрабаванні да сваіх мам, чым ненароджаныя дзеткі. Але ўсе імгненна разумеюць, што гэтыя аргументы не дзейнічаюць, калі гутарка вядзецца пра забойства старэйшых дзяцей.

Часта жанчыны кажуць, што калі яны рабілі аборт, яны нават не ўяўлялі пра тое, хто быў унутры іх. Некаторыя падсвядома ведалі, што яны вынашваюць дзіця, але яны павяліся на бесчалавечную рыторыку груп "за выбар". Зараз яны вельмі глыбока шкадуюць аб гэтым. Яны ўспрымаюць тое, што яны зрабілі, як вынік часовага зацямнення свядомасці, якое стварылася пры дапамозе блізкіх людзей, якія мелі добрыя намеры, але самі былі ўведзеныя ў зман. Яны хацелі б, каб у той час знайшоўся чалавек, які паспрабаваў бы адгаварыць іх ад выбару, наступствы якога зараз не даюць ім спакою.

Мы павінны любіць і клапаціцца пра цяжарных жанчын, якіх прымушаюць да аборту. Мы таксама павінны любіць жанчын, якія зрабілі аборт, і дапамагчы ім пераадолець траўму, нанесеную абортам.

Старажытная кніга Прыпавесцяў кажа, што правільны выбар заўжды мудры і нясе добрыя наступствы, у той час як памылковы выбар заўсёды неразумны і нясе дрэнныя наступствы.

## Памылковае падзяленне

Ніколі забойства дзіця ні для каго не можа быць найлепшым вырашэннем. Калі маці раніць сваё дзіця, гэта прыносіць шкоду не толькі дзіцяці, але і маці. Немагчыма аддзяліць шчаснасць маці ад стана яе дзіця. Менавіта з-за таго што ненароджаны з'яўляецца дзіцём, наступствы яго забойства вельмі сур'ёзныя. Факт таго, што першая ахвяра з'яўляецца жывым дзіцём, прыносіць шкоду другой ахвяры – маці. Вось чаму нам неабходна, разбіраючыся з пытаннем абортаў, перадусім разабрацца з ідэнтычнасцю ненароджанага дзіця.

# Частка 2

# ДЗІЦЯ



# ГЛАВА 3

# ЦІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НЕНАРОДЖАНАЕ ДЗІЦЯ САПРАЎДНЫМ ЧАЛАВЕКАМ?

Абаронцы пазіцыі "за выбар" раней часта казалі: "Нельга вызначыць, калі пачынаецца чалавечае жыццё. Гэта рэлігійнае пытанне і навука не можа даць на яго адказ". Большасць ужо пакінула гэтую пазіцыю, бо дзесяцігоддзі навуковых даследаванняў пярэчаць ёй. Аднак жа гэтае састарэлае вераванне настолькі моцна ўкаранілася ў розумах некаторых людзей, што і сёння шмат хто трымаецца яго.

Адзінае, што дае шанец логіцы "за выбар" перамагаць, – вера людзей у тое, што ненароджаныя дзеткі – непаўнавартасныя людзі. Але хіба так яно насамрэч?

## Што кажуць навукоўцы?

Доктар Альфрэд М. Бонджаанні, прафесар кафедры акушэрства Універсітэта Пенсільваніі, піша:

*"З маёй ранейшай медычнай адукацыі я даведаўся, што жыццё пачынаецца з моманту зачацця... што можна казаць пра наяўнасць чалавечага жыцця на ўсіх этапах ад зачацця да сталасці... усякае перапыненне гэтага шляху ў любы момант ёсць заканчэннем чалавечага жыцця"*[6].

Гаворачы пра ранейшыя стадыі развіцця дзіця ва ўлонні маці, прафесар Бонджаанні кажа: *"У мяне не больш падстаў казаць, што дзіця на гэтых ранніх стадыях свайго развіцця – недасканалая чалавечая істота, чым сцвярджаць, што дзіця да перыяду палавой спеласці не з'яўляецца чалавечай істотай. Гэта чалавечае жыццё на любой стадыі"*[1].

Жэром Лежэн, у свой час прафесар генетыкі ва Універсітэце Дэкарта ў Парыжы, сцвярджаў: "Пасля таго як апладненне адбы-

лося – новая чалавечая істота стварылася." Лежэн сказаў: "гэта болей ужо не з'яўляецца справай густу або меркавання. Кожная асоба мае вельмі дакладны пачатак. І гэты пачатак – зачацце"[2].

Прафесар Мішэлін Мацьюс-Рот з Гарвардскай медычнай школы піша: "Навукова карэктна казаць, што асобнае чалавечае жыццё пачынаецца з моманту зачацця."

Момант стварэння кожнай асобы – гэта момант яе зачацця. Да гэтага моманту індывідуума (з яго ўнікальным ДНК) не існуе. З моманту зачацця ён пачынае існаваць[3].

І ў гэта вераць не толькі людзі, якія выступаюць "за жыццё". Гаспадар адной з найбуйнейшых клінік абортаў у штаце Арыгон, пад прысягай сказаў наступнае: "*Канешне*, чалавечае жыццё пачынаецца ад зачацця."[4] Адзначаная ўзнагародамі свецкая кніга "Ад зачацця да нараджэння", апісвае ўзнікненне дзіцяці пры зачацці і яго развіццё аж да нараджэння[5].

Наколькі зразумелым з'яўляецца доказ таго, што чалавечае жыццё пачынаецца ад зачацця? Адно з міжнародных апытанняў выявіла, што толькі 13% брытанцаў абралі "зліццё сперматазоіда з яйцаклеткай" як момант біялагічнага пачатку чалавечага жыцця[6]. Нягледзячы на гэта, у Амерыцы Генеральная Асамблея штата Місуры пераважнай большасцю галасоў прыняла у 2003 годзе законапраект, які кажа:

*"Генеральная Асамблея гэтага штата высветліла, што[1] жыццё кожнай чалавечай істоты пачынаецца ад моманту зачацця; ненароджанныя дзеці маюць інтарэсы ў жыцці, здароўі і дабрабыце, якія павінны быць абароненыя... Тэрмін "ненароджаныя дзеці" або "ненароджанае дзіця" павінны ўключаць усіх ненароджаных дзяцей або нашчадкаў чалавечых істотаў ад моманту зачацця да нараджэння на кожным этапе біялагічнага развіцця"[7].*

Нядаўна аплодненая яйцаклетка ўтрымлівае ўражлівы аб'ём генетычнай інфармацыі, дастатковай, каб кантраляваць асабісты рост і развіццё на працягу ўсяго жыцця. Нітка ДНК з адной клеткі чалавечага арганізма утрымлівае аб'ем інфармацыі сувымяральны з бібліятэкай у тысячу тамоў[8].

Клеткі арганізма новай асобы імкліва падзяляюцца і памнажаюцца, што прыводзіць да фенаменальнага росту. Рост ёсць таму, што ёсць жыццё. Яшчэ задоўга да таго, як жанчына даведваецца, што яна цяжарная, унутры яе ўжо расце жывая чалавечая істота.

На працягу 5-9 дзён пасля зачацця новая асоба хаваецца ў сценку маткі для бяспекі і сілкавання. Ужо на гэтым этапе яго ці яе пол можа быць вызначаны навуковымі сродкамі. Да чатырнаццатага дня дзіця пачынае вылучаць гармон, які прыпыняе менструальны цыкл маці. Праз два тыдні можна будзе заўважыць ясныя чалавечыя рысы, а яшчэ праз тры тыдні яны становяцца відавочнымі. І гэтыя істоты ўжо з'яўляюцца паўнавартаснымі членамі чалавечай расы.

У момант зачацця ненароджанае дзіцё не выглядае падобным да чалавека, асабліва для нас, людзей, якія прызвычаіліся меркаваць пра чалавечнасць паводле знешнасці. Тым не менш, у аб'ектыўным навуковым сэнсе яны такія ж людзі, як дзеці або дарослыя.

Праз 18 дзён пасля зачацця сэрца пачынае фармавацца і вочкі пачынаюць развівацца. На дваццаць першы дзень сэрца ўжо пампуе кроў па целе. На 28 дзень у дзіцяці ўжо ёсць зачаткі ручак і ножак. Да 30 дня ўжо з'яўляецца мозг, і дзіцёнак павялічваецца ўжо ў 10 000 разоў.

Да 35 дня фармуюцца рот, вушкі і носік. На 40 дзень ужо можна зрабіць запіс біярытмаў мозгу, а сэрцабіццё, якое пачалося за 3 тыдні да гэтага, можна пачуць праз ультрагукавы стэтаскоп. Да 42 дзён шкілет ужо сфармаваны і мозг кантралюе рух мускулаў і органаў.

Няважна, як ён ці яна выглядае – дзіця ёсць дзіця. І заўжды аборт спыняе жыццё гэтага дзіцяці. Нават самыя раннія метады абортаў, у тым ліку Міфетпрыстон і ўсе таблеткі для абортаў, занадта позніяі не дазваляюць пазбегнуць перапынення жыцця.

# Драма жыцця

Фатограф Ленарт Нільсан вядомы перадусім сваімі ўнутрыўлонневымі фотаздымкамі. Найбольшую папулярнасць яму прынеслі ягоныя фота-эсэ у часопісе Life і кніжка "Дзіця нараджаецца". У сваёй кнізе "Драма жыцця да нараджэння", Ленарт напісаў наступнае пра дзіця ўзростам 45 дзён пасля зачацця (мноства жанчын даведваюцца пра сваю цяжарнасць пазней за гэты тэрмін):

*"Хаця эмбрыён важыць толькі 1 грам, ён ужо мае ўсе ўнутраныя органы дарослага на розных стадыях развіцця. У яго ўжо ёсць маленькі роцік з губкамі, пачатак язычка і зародышы для дваццаці малочных зубоў. Ягоныя плоцевыя і рэпрадуктыўныя органы пачынаюць развівацца"*[9].

Да 8 тыдняў ручкі і ножкі амаль дасканала сфармаваныя. На 9 тыдні, дзіця ўжо будзе згінаць пальчыкі вакол прадметаў, пакладзеных у далонь. Пазногці фармуюцца і дзяця пачынае смактаць свае пальцы. На гэтым тэрміне дзіця "ўжо робіць дасканалы кульбіт, сальта назад і «ўдар цераз сябе»"[10].

Ненароджанае дзіця ўжо адгукаецца на стымулы і ўжо здольнае адчуваць боль[11]. Пры гэтым аборт на гэтым тэрміне завецца "раннім абортам".

На дзясятым тыдні дзіця ўжо глядзіць, глытае, хмурыць бровы. На адзінаццатым тыдні яны пісаюць, робяць мноства розных выразаў твару і нават усміхаюцца[12]. На дванаццатым тыдні дзіця пачынае ударацць і паварочваць ножкай, круціць і махаць пальчыкамі, складаць іх у кулачок, рухаць вялікімі пальцамі, згінаць запясце і адкрываць роцік[13].

Усё гэта адбываецца ў першым трыместры, у першыя тры месяцы жыцця. У астатнія шэсць месяцаў нічога новага ва ўлонні не фармуецца і не развіваецца. Некранутае дзіця толькі расце і сталее – калі ягонае жыццё не будзе знішчана з-за выкідку або аборту.

Гэты навуковы факт немагчыма аспрэчыць: кожны хірургічны аборт спыняе сардэчка, якое ўжо б'ецца, і біярытмы мозгу, якія ўжо магчыма вымяраць.

Як мы называем стан, калі ў асобы няма больш сэрцабіцця і біярытмаў мозгу? Смерць.

Як мы павінны называць стан, калі сэрцабіццё і біярытмы мозгу ёсць? Жыццё! Кожны аборт спыняе чалавечае жыццё.

## П.У.А.С.

Скот Клюсендорф кажа: "Адказ на пытанне «Хто гэта?», больш важны за ўсе астатнія разважанні"[14]. Ён указвае, што ёсць толькі 4 адрозненні паміж ненароджаным і нованароджаным дзіцём.

Іх можна запомніць праз абрэвіятуру "ПУАС"[15], якая азначае:

***Памер.*** Ці вызначае тое, наколькі ты вялікі, кім ты з'яўляешся?

***Узровень развіцця.*** Хіба дваццацігадовыя больш людзі, чым дзесяцігадовыя з-за таго, што яны мацнейшыя і разумнейшыя?

***Асяродак.*** Хіба робіць вас знаходжанне ўнутры дома чалавекам у большай ці меншай ступені ў параўнанні з тым, хто знаходзіцца вонкі? Ці знаходжанне ўнутры матчынага цела робіць дзіця менш чалавекам, чым пры знаходжанні вонкі?

***Ступень залежнасці.*** Ці вызначае залежнасць ад іншай асобы, кім ты з'яўляешся? Ці з'яўляецца нехта з хваробай Альцгеймера або з патрэбай у рэгулярным дыялізе менш чалавекам? Ці з'яўляюся я, інсуліназалежны дыябетык, менш чалавекам, чым я быў да таго, як сутыкнуўся з хваробай?

Трохмесячнае дзіця ў параўнанні з дзіцём дзесяцігадовым значна меншае па памеры, значна менш развітое і настолькі ж няздольнае само пра сябе клапаціцца, як і яшчэ ненароджанае дзіця.

Пытанне не ў тым, наколькі вялікім, або разумным, або нязручным з'яўляецца ненароджанае дзіця. Пытанне ў тым, кім яно з'яўляецца?

## ГЛАВА 4

# ЯКАЯ РОЗНІЦА ПАМІЖ СПЕРМАТАЗОІДАМ, ЯЙЦАКЛЕТКАЙ, ЭМБРЫЁНАМ І ПЛАДОМ?

За два гады да таго, як аборты былі легалізаваныя ў Злучаных Штатах, адзін абаронца пазіцыі "за выбар" даваў наступныя інструкцыя ў адным уплывовым медычным часопісе: "Неабходна ўжываць такія словы, канцэпцыі і законы, каб аддзяліць ідэю абортаў ад ідэі забойства" [1]. У тым жа годзе на медычным сімпозіуме ў Лос-Анжэлесе вучылі так: "Калі вы скажаце: «Высмакчам дзіця», гэта можа лёгка выклікаць або паглыбіць траўму. Замест гэтага лепш кажыце «Ачысцім матку» або «Выскрабем змесціва маткі», але ніколі – «Выскрабем дзіця» [2].

Мова – гэта не толькі адлюстраванне мыслення, гэта яшчэ і спосаб фармавання мыслення. Ужытыя словы ўплываюць на нашае ўспрыманне ідэі. Уплываюць настолькі, што ідэя, выказаная шчырай прамой тэрміналогіяй, становіцца агіднай.

Словы, якія фіксуюць увагу на цяжарнасці і матцы, адцягваюць увагу ад асобы, якая знаходзіцца ў гэтай матцы. Але безадносна да таго, як мы гэта называем, – "ачышчэнне маткі" або "перапыненне цяжарнасці" – гэта ўсё адно знішчэнне чалавечага жыцця.

Адна феміністка, якая выступае "за жыццё" сказала: "Прыхільнікі пазіцыі «за жыццё» не супраць перарывання цяжарнасці. Цяжарнасць доўжыцца нядоўга. Мы згодны абмежаваць яе дзевяццю месяцамі. Мы супраць забойства дзяцей" [3].

Як і тэрміны "груднічок" або "падлетак", тэрміны "эмбрыён" і "плод" не абазначаюць "не-людзей", але людзей на пэўным этапе развіцця. Напрыклад, лацінскае слова "foetus",

якое ў ангельскай мове выкарыстоўваецца для абазначэння плода, можа яшчэ перакладацца як "нашчадак", "малады" або "маленькае дзіця".

Навукова некарэктна казаць, што чалавечы эмбрыён або зародыш не з'яўляецца чалавекам з-за таго, што ён знаходзіцца на ранейшай ступені развіцця, ніж немаўля. Гэта тое ж самае, як сцвярджаць, што груднічок не з'яўляецца чалавекам з-за таго, што ён яшчэ не падлетак. Адна мая дачка на 2 гады старэйшая за другую. Ці значыць гэта, што яна на два гады лепшая? Ці становіцца нехта "больш чалавекам", калі становіцца большым? Калі так, атрымліваецца, што дарослыя "больш людзі", ніж дзеці, а гульцы ў рэгбі "больш людзі", ніж жакеі. "Не-чалавек" не ператвараецца ў чалавека, стаўшы больш дарослым або вялікім. Кожны чалавек ёсць чалавекам ад пачатку.

## Ці з'яўляецца сперматазоід або яйцаклетка чалавекам?

Вядомы амерыканскі астрафізік Карл Саган спрабаваў падняць апанентаў на смех пытаннем: "Чаму знішчэнне сперматазоіда або яйцаклеткі не з'яўляецца забойствам?"[4] Адказ, які павінны ведаць кожны навуковец, палягае ў тым, што ёсць фундаментальнае адрозненне паміж сперматазоідам ці неаплодненай яйцаклеткай з аднаго боку і аплодненай яйцаклеткай (або зіготай) з іншага. Як і клеткі валасоў ці сэрца, ані сперматазоід, ані яйцаклетка не могуць стаць чымсьці іншым. Але калі яйцаклетка і сперматазоід зліліся, пачалося новае, актыўнае і генетычна ўнікальнае жыццё.

Гэтае жыццё не сперматазоід, не яйцаклетка і не проста іх спалучэнне. Аплодненая яйцаклетка – гэта новая чалавечая істота. Гэта асоба, якая жыве сваім уласным жыццём, развіваецца сваім самастойным шляхам. Ад моманту апладнення гэтая адзіная першая клетка ўтрымлівае ўвесь генетычны код

ва ўсёй яго складанасці, кожную дэталь чалавечага развіцця, у тым ліку пол дзіцяці, колер вачэй і валасоў, вышыню, колер скуры[5]. Вазьміце адну такую толькі што аплодненую яйцаклетку, змясціце яе побач з клеткай шымпанзэ, і генетык з лёгкасцю вызначыць чалавечую клетку з дзвюх. Яе чалавечая прырода ўжо відавочная[6].

Выкарыстанне тэрміну "прадукт зачацця" (Product of conception (POC) – дэперсаналізацыя ненароджаных дзетак. Насамрэч, немаўля, дзесяцігадовае дзіця і дарослы чалавек з'яўляюцца "прадуктамі зачацця" не ў меншай і не ў большай ступені, чым плод. Як прадукт зачацця каня – заўжды конь, гэтаксама прадукт зачацця чалавека – заўжды чалавек.

Дэбаты вакол даследавання ствалавых клетак эмбрыёнаў – яскравы прыклад сілы слоў. Ствалавыя клеткі - гэта шматфункцыянальныя базавыя клеткі, з якіх пазней развіваюцца разнастайныя тканкі і органы. Яны лічацца асноўным матэрыялам для біямедычных даследаванняў і іх можна атрымаць з дабраякасных чалавечых крыніц, у тым ліку дзеяздольных дарослых, пупавіннай крыві і плацэнты. Але шматлікія навукоўцы аддаюць перавагу ствалавым клеткам з эмбрыёнаў дзяцей, якія ў выніку гэтага паміраюць. У Аб'яднаным Каралеўстве чалавечыя ствалавыя клеткі з эмбрыёна былі ўпершыню вырашчаныя ў Каралеўскім Коледжы Лондана[7].

На афіцыйным сайце "The Guardian" 1 сакавіка 2009 г. была прыведзена цытата Джазэфіны Квітнавіль – прадстаўніцы лабісцкай групоўкі "Водгук на рэпрадуктыўную этыку", у якой яна кажа, што "палова Еўропы выступае супраць даследаванняў ствалавых клетак эмбрыёнаў"[8]. Гэтыя этычныя дэбаты маюць сур'ёзны практычны ўплыў на тое, як мы бачым чалавечых істот і ці дапускаем мы іх выкарыстанне для абслугоўвання патрэбаў іншых[9].

Цікава, што Нацыянальны інстытут здароўя (Міністэрства аховы здароўя і сацыяльных служб ЗША) высветліў, што грамадскасць выступае супраць "даследаванняў эмбрыянальных ствалавых клетак чалавека", якія знішчаюць чалавечых эм-

брыёнаў падчас эксперыментаў. Тады Нацыянальны інстытут здароўя вынайшоў новы тэрмін для апісання дакладна той жа справы: "даследаванне плюрыпатэнтных ствалавых клетак чалавека". Новае азначэнне заклікана прыхаваць факт таго, што аб'ектам гэтых даследаванняў з'яўляюцца чалавечыя эмбрыёны.[10] Замест таго, каб спыніць неэтычную працэдуру, яны проста знайшлі для яе іншае імя.

## Няма сумненняў

Калі аднойчы кланаванне чалавека пройдзе паспяхова, асоба ўвойдзе ў жыццёвы кантынуум у момант пасля зачацця. Гэта ніяк не паўплывае на ягоны статус чалавека. Важна не тое, як чалавек патрапіў на жыццёвы кантынуум, а тое, што ён там ёсць.

Прафесар Томас Хільгерс сцвярджае: "Ніякае асобнае жывое цела не можа "стаць" асобай, калі яно асобай не з'яўляецца. Ніякая жывая істота не можа стаць чымсьці іншым, адрозным ад таго, чым яно з'яўляецца ў сваёй сутнасці"[11].

Тыя, хто робяць аборты, становяцца ўсё болей шчырымі ў прызнанні таго, што адбываецца пры абортах. Прафесар Уорэн Херн, які вучыць дактароў, як праводзіць аборты, апісвае сваю працу:

*"Я пачаў рабіць аборт маладой жанчыне на васямнаццатым тыдні цяжарнасці... Потым я ўклаў хірургічныя абцугі ў матку і прыклаў іх да галавы плада, які ўсё яшчэ быў жывы з-за таго, што смяротная ін'екцыя не працуе на гэтым этапе цяжарнасці. Я зачыніў абцугі, ламаючы чэрап плада, і выцягнуў абцугі. Плод, цяпер ужо мёртвы, застаўся больш-менш непашкоджаным"*[12].

Гэты чалавек прысвяціў усё сваё жыццё правядзенню абортаў, ён вучыць іншых, як іх рабіць, і ён не мае абсалютна ніякіх сумненняў, што аборт забівае дзіця.

## ГЛАВА 5

# ЦІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НЕНАРОДЖАНАЕ ДЗІЦЯ ЧАСТКАЙ МАТЧЫНАГА ЦЕЛА?

Як і многія іншыя, філосаф Мортымер Адлер сцвярджае, што ненароджанае дзіця *"ёсць часткай матчынага цела ў тым жа сэнсе, у якім рука або нага чалавека з'яўляецца часткай жывога арганізма. Асабістае вырашэнне аб ампутацыі рукі або нагі застаецца ў прыватнай сферы чалавека. У чалавека ёсць права зрабіць што заўгодна са сваім целам, калі гэта не наносіць шкоду іншым людзям або грамадскаму здароўю"*[1].

Частка цела вызначаецца паводле агульнага генетычнага кода, які супадае з целам. Кожная клетка матчынай міндаліны, апендыкса, сэрца і лёгкіх мае аднолькавы генетычны код. У ненароджанага дзіцяці таксама ёсць генетычны код, але ён істотна адрозніваецца ад матчынага. Кожная клетка ў арганізме дзіцяці – унікальная клетка, якая адрозніваецца ад любой клеткі ў арганізме ягонай маці. Часта ў іх розныя групы крыві, а ў палове выпадкаў – розны пол.

Калі пры цяжарнасці існуе толькі арганізм маці, тады ў яе ёсць два насы, чатыры нагі, два наборы адбіткаў пальцаў, два мозга, дзве крываносныя сістэмы і два шкілеты. У палове выпадкаў у яе таксама ёсць мужчынскія геніталіі. Калі ж для жанчыны немагчыма мець мужчынскія геніталіі, тады і хлопчык, якога яна выношвае, не можа быць часткай яе арганізма.

Яйцаклетка кітаянкі, змешчаная ў шведскую жанчыну, назаўжды застанецца "кітайскай", а не "шведскай", таму што ідэнтычнасць заснаўваецца на генетычным кодзе, а не на целе, у якім змяшчаецца яйцаклетка.

Дзіця можа памерці, а маці можа жыць. Або маці можа памерці, а дзіця – выжыць. Гэта з'яўляецца пацвярджэннем таго, што яны – два індывідуумы[2].

Падчас перынатальных аперацый ненароджанае дзіця (яшчэ злучанае з маці пупавінай) дастаюць з улоння, яму робяць анэстэзію і аперацыю. Пасля дзіця вяртаецца ў маці. Дзіця называецца пацыентам. Яно мае свае медычныя запісы, дзе ўказана яго група крыві і асноўныя паказчыкі стану арганізма.

У 1999 г. ненароджанаму дзіцяці, якога звалі Самуэль Армас, рабілі аперацыю па карэкцыі расшчаплення пазваночніка. Ягоны фотаздымак у часопісе “Life” прыцягнуў сусветную ўвагу. Калі хірург ужо сканчваў сваю працу, малыш Самуэль высунуў ручку з улоння і схапіў палец хірурга. Фотажурналіст Майкал Клэнсі зафіксаваў гэтае дзівоснае дзеянне на плёнку. Клэнсі потым пісаў:

*“Нечакана ўся ручка рэзка высунулася з надрэзу, затым схавалася назад так, што засталася толькі далонь. Доктар дакрануўся і падняў ручку, якая адрэагавала на гэта, абхапіўшы палец доктара. Правяраючы сілу, доктар трошку патрос маленькі кулачок. Самуэль моцна трымаўся. Я сфатаграфаваў! Ух ты!”*[3]

Самуэля Армаса зашылі назад у матчына ўлонне, і ён нарадзіўся праз 4 месяцы. Як гэтая карціна, калі Самуэль схапіў за палец доктара, паўплывала на Клэнсі? Клэнсі памяняў сваю пазіцыю “за выбар” на пазіцыю “за жыццё”. Вось, што ён сказаў пазней: “Дзве гадзіны пасля аперацыі я быў проста ў шоку.... Цяпер я ведаю, што аборты – гэта няправільна. Гэта абсалютна няправільна!”[4]

Ці нехта сапраўды можа сур’ёзна верыць у тое, што гэты маленькі пацыент, здольны абняць палец і адчуць боль, усяго толькі прыдатак да матчынага цела? Няўжо нехта сур’ёзна можа выказвацца, што будзе законна забіць гэтага самага пацыента ў любы момант на працягу чатырох месяцаў, якія застаюцца яму да нараджэння?

# Непаслядоўнасць паўсюль

У медычным універсітэце Паўднёвай Караліны, калі ў аналізах цяжарнай жанчыны будзе знойдзены какаін, яе могуць арыштаваць за распаўсюд наркотыкаў непаўналетнім. У Ілінойсе цяжарная жанчына, якая прымае недазволеныя прэпараты, можа быць пакарана за "дастаўку забароненых рэчываў непаўналетнім". Гэта яскравае прызнанне таго, што ненароджанае дзіця з'яўляецца асобай са сваімі правамі і заслугоўвае абароны нават з боку сваёй маці.

Тым не менш, гэтая самая жанчына, якую маглі пераследаваць і арыштаваць за стварэнне небяспекі для дзіцяці, *мае права забіць тое ж самае дзіця праз аборт.* Атрымліваецца, што нанесці шкоду свайму дзіцяці – супрацьзаконна. Але цалкам законна забіць гэтае ж дзіця.

Любая ўстанова, дзе можна набыць алкаголь у штаце Арыгон, павінна мець наступны надпіс:

***"Цяжарнасць і алкаголь – НЕ ЗМЕШВАЦЬ!***
***Ужыванне алкагольных напояў, у тым ліку віна,***
***асвяжальных напояў і піва можа выклікаць***
***прыроджаныя дэфекты".***

Калі алкаголь шкодзіць ненароджаным дзецям, што ж аборт робіць з імі?

У Злучаных Штатах Кангрэс адзінадушна прагаласаваў за адкладанне смяротнага пакарання цяжарнай жанчыне да моманту нараджэння яе дзіцяці. Кожны кангрэсмен, нават з пазіцыяй "за выбар", разумеў, што ненароджанае дзіця – асобная істота, невінаватая ў злачынствах маці. Ніякіх адкладанняў пакарання не было прапанавана для матчыных міндалін, сэрца або нырак.

Многія штаты ў Амерыцы прынялі законы аб забойстве плода, называючы гэта забойствам. Аднак маці можа свабод-

на забіць сваё дзіця. Гэтыя законы – відавочнае пацвярджэнне таго, што дзіця з'яўляецца чалавекам. У 2004 г. Кангрэс прыняў "Акт аб ненароджаных ахвярах гвалту", які сцвярджае, што любы, хто "наўмысна заб'е або пакусіцца на забойства ненароджанага дзіцяці ... будзе пакараны ... за забойства або пакушэнне на забойства чалавека"[5].

Звярніце ўвагу на дзіўнае ўжыванне падвойных стандартаў. Калі жанчына запісалася на аборт, і па дарозе ў абартарый яе дзіця заб'юць ва ўлонні, забойца будзе пераследавацца за забойства. Але, калі забойства па дарозе не адбудзецца, праз гадзіну доктару заплоцяць за правядзенне законнай працэдуры забойства *дакладна таго ж самага дзіцяці* (прычым, магчыма, больш жорсткага).

## Урок Луіс Браўн

Быць унутры чагосьці не тое ж самае, што быць часткай чагосьці. (Машына не становіцца часткай гаража з-за таго, што яна ў ім запаркаваная.) Луіс Браўн – першае дзіця з "прабіркі" было зачата, калі сперматазоід злучыўся з яйцаклеткай у кубку Петры. Ці стала яна часткай матчынага арганізма, калі была змешчана ва ўлонні? Не больш, чым яна была часткай кубку Петры, калі жыла ў ім.

Чалавечыя істоты не павінны дыскрымінавацца з-за свайго месца знаходжання. У нараджэнні няма нічога такога, што робіць дзіця чымсьці прынцыпова іншым у параўнанні з тым, кім яно было да нараджэння. Не адбываецца ніякіх цудаў, якія перамяняюць прыроду дзіця, калі яно перасоўваецца на пяцьдзясят сантыметраў з нутра маці вонкі.

# ГЛАВА 6

# ШТО НАМ КАЖУЦЬ ВЫЯВЫ?

Найбольшай "няўдачай" для ненароджанага дзіця заўжды была адсутнасць акенца ва ўлонні. Лёс дзетак знаходзіцца ў руках тых, хто нават бачыць іх не можа. Але за апошнія гады сітуацыя перамянілася карэнным чынам.

"Time" у 2002 г. і "Newsweek" у 2003 прысвяцілі свае вокладкі захапляльным ультрагукавым выявам ненароджаных дзетак.[1] "Newsweek" на сваёй вокладцы задаецца пытаннем: "Ці павінны быць правы ў плода? Як навука змяняе дыскусію." Усе аргументы проста выпарыліся перад тварам ненароджанага дзіцяці.

## Сіла ўльтрагуку

У ЗША Рэбэка Нанкэроў зрабіла ўльтрагукавое даследаванне за 80 даляраў у "Запланаваным бацькоўстве" (Федэрацыя запланаванага бацькоўства Амерыкі), але ёй не дазволілі паглядзець на вынікі, таму што "ад гэтага вам будзе толькі цяжэй". Незадаволеная, яна пайшла ў цэнтр падтрымкі цяжарных, дзе ёй зрабілі бясплатнае УГД і дазволілі паглядзець вынікі.

Яна сказала: "Калі б я не пабачыла эхаграмы, я б зрабіла аборт. Але выява, атрыманая падчас ультрагуку, пераканала мяне на 100%, што ўнутры мяне было жыццё. Жыццё, а не тканіна або кропля[2].

Паводле дадзеных Томаса Глеснэра, *"да з'яўлення ўльтрагуку, цэнтры цяжарнасці паведамлялі, што з жанчын "настроеных на аборт", якія прыходзілі на даследаванне альбо кансультацыю, недзе 20-30% вырашалі захаваць цяжарнасць. Калі цэнтры цяжарнасці пачалі выкарыстоўваць апараты УГД, гэта прапорцыя падскочыла да 80-90%[3].*

Адры Стаут, медсястра, распавядала мне пра УГД, якое яна праводзіла. Тое дзіця "адчыняла і зачыняла свой роцік, ікала, клалася на спінку, нібыта ляжала ў шызлонгу, выцягвала ножкі. Яно нават так трымала руку, што маці змагла палічыць пальчыкі. Было бачна, што маці гэта вельмі кранула." Калі Адры скончыла сканаванне, яна запыталася ў маці, што яна плануе рабіць. "Яна адказала, што захавае сваё дзіця. Я запыталася, ці паўплывала на яе неяк УГД. Яна адказала: "«Вельмі істотна. Я прыйшла сюды проста пераканацца ў цяжарнасці, каб зрабіць аборт»"[4].

Тысячы гісторый, накшталт гэтай, прыходзяць да нас з цэнтраў цяжарнасці, якія выкарыстоўваюць ультрагук. Інтэрнэт-сайты паказваюць дзівосныя ўльтрагукавыя выявы, на якіх відаць, як ненароджаныя дзеткі ўсміхаюцца, пазяхаюць, выцягваюцца і спяць[5].

Пры гэтым здзіўляе тое, наколькі моцным застаецца адмаўленне. Калі я паказаў унутрыўлонневы фотаздымак васьмітыднёвага ненароджанага дзіцяці адной актывістцы "за выбар", разумнай адукаванай жанчыне, яна адказала мне: "Няўжо ты сапраўды думаеш кагосьці надурыць гэтым падробленым фотаздымкам?" Я сказаў, што яна можа звярнуцца да падручнікаў медычнай школы Гарвардскага ўніверсітэта, часопіса "Life"[6], або кнігі Нільсана "Дзіця нараджаецца"[7] і знайсці дакладна такія ж здымкі. Яна і слухаць не захацела. Чаму? Гэтым яна сказала:

"Відавочна, на фотаздымку – дзіця. А з-за таго, што я не хачу верыць, што аборт – гэта забойства дзіцяці, я адмаўляюся верыць у сапраўднасць гэтай фатаграфіі."

## Што паказваюць астанкі?

Фільм *"Дар выбару"* сцвярджае, што ненароджанае дзіця – гэта "магчымасць будучай асобы". Але што застаецца пасля аборту? Толькі маленькае, але дасканала сфармаванае цела –

ручкі і ножкі, далоні і ступні, тулава і галава. Астанкі сведчаць не пра канец магчымага жыцця, яны ўказваюць на канец ужо існуючага. Калі вы гэтаму не верыце, паглядзіце на астанкі пасля аборту![8] Калі вы не здолееце глядзець на гэта, задайце сабе пытанне – чаму? Калі гэта ўсяго толькі тканіна, а не расчлененае дзіця, глядзець на гэта не будзе цяжка.

У сваім падручніку "Практыка аборту" прафесар Уорэн Херн піша: "Доўгія закругленыя нажніцы Майо могуць спатрэбіцца каб абезгаловіць і расчляніць плод"[9]. Для таго, каб абезгаловіць, патрэбная галава, а для таго, каб расчляніць – патрэбны члены цела. Кавалкі плоці або кроплі тканіны не абезгалоўліваюцца і не расчляняюцца.

Чаму тыя ж самыя людзі, якія спакойна глядзяць на крывавыя забойствы і жахлівыя ўскрыцці трупаў у папулярных драмах, выступаюць супраць распаўсюду фотаздымкаў абортаў? Найомі Вулф, феміністка, якая выступае "за выбар", кажучы пра здымкі абартаваных дзяцей, прызнае:

*"Для многіх актывістаў "за выбар" такія выявы – гэта адваротная прапаганда. Па шчырасці, мы разумеем, што жахлівасць выяваў грае на руку актывістам "за жыццё". Тое, што яны імкнуцца паказаць, ператварыла б наш свет, дай ім хоць мінімальны шанец, у поўнае страхаў і боязяў месца. Людзі нашых поглядаў разглядаюць такія матэрыялы, як парнаграфію руху "за жыццё". Але фемінізм у сваіх лепшых праявах грунтуецца на тым, што з'яўляецца праўдай. У той час, як у руках актывістаў "за жыццё" выявы жорсткай смерці плода становяцца неверагоднай зброяй у палітычнай палеміцы, самі фотаздымкі непалімічныя – гэта біялагічныя факты. Мы гэта ведаем"*[10].

## Права застацца ў няведанні

Калі кандыдат, які трымаецца пазіцыі "за жыццё" ў тэлевізійнай рэкламе па нацыянальным тэлебачанні паказвае абартаваных дзетак, людзі пачынаюць абурацца. Рэпарцёр

вечаровых навін на канале CBS з гэтай нагоды сказаў, што дэбаты па абортах дасягнулі "новых нізінаў безгустоўнасці". Дзіўна, што не было ніякага абурэня з-за таго, што дзяцей забіваюць... Абурэнне выклікала толькі тое, што ў кагосьці хапіла мужнасці паказаць, як іх забіваюць.

Пытанне, якое варта задаць, не "чаму актывісты «за жыццё» паказваюць гэтыя здымкі", але "чаму нехта пачынае абараняць тое, што выяўлена на гэтых здымках". Сапраўдная шуміха вакол гэтых выяў ненароджаных дзяцей выклікана не тым, што яны вельмі крывавыя, а тым, што яны пацвярджаюць правату пазіцыі "за жыццё".

Унутрыўлонневыя фотаздымкі і ўльтрагукавыя здымкі не з'яўляюцца агіднымі, яны прыгожыя і захапляльныя. Ці вітаюць актывісты "за выбар" гэтыя выявы? Не. Арганізацыі па абароне права на аборты называюць ультрагукавыя выявы "зброяй" у руках руху па абароне жыцця[11]. Часам, клінікі прапануюць ультрагукавыя здымкі рэальнага часу ў 3D (іх яшчэ называюць 4D). На гэтых здымках дзеткі чхаюць, пазяхаюць, усміхаюцца. Падчас адной з дыскусій на канале PBS у ЗША адзін удзельнік абмеркавання выказаўся, што такія выявы адлюстроўваюць "нездаровую заклапочанасць дзіцем"[12]. Звярніце ўвагу на тэрміналогію: "дзіцем". Ультрагукавыя тэхналогіі руйнуюць стары аргумент "за выбар", які гучыць як "Хіба ж гэта дзіця?!" Зараз людзі адказваюць: "Пра што вы кажаце?! Канечне, гэта – дзіця! Проста *паглядзіце*!"

## Пераадольванне адмаўлення

Халакост быў настолькі жахлівым, што яго немагчыма апісаць толькі словамі. Апісанне нацысцкіх лагераў смерці доўга публікаваліся ў газетах, але калі гэтыя ж выданні пачалі друкаваць фотаздымкі масава замардаваных людзей, грамадскасць, у рэшце рэшт, прачнулася. Калі б не фотаздымкі, нават сёння большасць з нас не здолела б зразумець або паверыць у Халакост.

Аднойчы мне давялося наведаць адзін універсітэцкі інтэрнат, дзе група актывістаў “за жыццё” зрабіла выставу, на якой здымкі абартаваных дзяцей віселі разам з выявамі ахвяр нацысцкіх лагераў смерці, месцаў масавых забойстваў, рабства і іншых гістарычных зверстваў. Знакі, якія папярэджвалі пра змест фотаздымкаў былі добра бачныя, таму ўсе, хто глядзелі выставу, рабілі гэта выключна па ўласным жаданні. Я магу засведчыць тое каласальнае ўражанне, якое выстава зрабіла на студэнтаў і выкладчыкаў, нават на тых, хто не хацеў верыць у тое, што бачыў.

Актывісты за правы жывёлаў кажуць, што для таго, каб дасягнуць іхняй мэты, яны павінны паказваць жахлівыя фотаздымкі, нарыклад, дзе маленькае цюляня забіваюць драўлянымі паліцамі. Калі ёсць месца, дзе можна пабачыць такія здымкі, ці не павінна быць месца, дзе можна паглядзець на здымкі абортаў? Калі аборт не з’яўляецца забойствам дзіцяці, тады чаму гэтыя выявы нас так непакояць?

Хіба забарона на публікацыю фотаздымкаў стала вырашэннем барацьбы з Халакостам? Ці вырашэннем стаў канец забойстваў?

Хіба забарона на публікацыю здымкаў мёртвых дзяцей з’яўляецца вырашэннем праблемы абортаў? Ці вырашэннем стане забарона абортаў?

## ГЛАВА 7

# ШТО РОБІЦЬ ЧАЛАВЕЧАЕ ЖЫЦЦЁ "ЗНАЧНЫМ"?

Прафесар Вільям Харысан, прыхільнік пазіцыі "за выбар", сцвярджае: "Сапраўднае пытанне ў дэбатах па абортах не "калі пачынаецца жыццё?", а "калі гэта жыццё становіцца маральна значным?"[1] Але хто вызначае, якія жыцці з'яўляюцца значнымі, а якія – не? Адказ заўжды наступны: моцныя людзі вызначаюць, ці з'яўляюцца жыцці слабейшых людзей значнымі.

## Двайны стандарт

Пітэр Сінгер, прафесар этыкі Прынстанскага ўніверсітэта, піша: "Жыццё плода не болей каштоўнае, чым жыццё іншых жывёл, якія знаходзяцца на падобным узроўні рацыянальнасці, самасвядомасці, дасведчанасці, здольнасці адчуваць і г.д."[2] (Ён, дарэчы, таксама верыць, што ёсць маральнае апраўданне забойству састарэлых людзей.)

Іншы прыхільнік абортаў, Джым Ньюхол, кажа: "Не кожны павінны нараджацца. Я веру, што для дзіця жыццё пачынаецца, калі маці хоча гэтае дзіця"[3]. Атрымліваецца, што чалавечае жыццё рэальнае, толькі калі іншая асоба цэніць яго?

У 1973 г. у прысудзе па справе "Рой супраць Вэйда" Вярхоўны суд ЗША задаваўся пытаннем ці з'яўляецца жыццё ненароджанага "значным". Але значным для каго? Да кожнага жывога цяпер чалавека, калі ён быў яшчэ ва ўлонні, калісьці паставіліся як да значнага, хіба не так? Інакш, не ўсе б зараз былі жывыя.

Белыя людзі вырашылі, што чорныя людзі "менш людзі". Мужчыны вырашылі, што жанчыны маюць менш правоў. На-

цысты вырашылі, што жыццё яўрэяў не мае значэння. Зараз вялікія людзі вырашылі, што маленькія людзі не дастаткова значныя, каб мець правы.

Індывідуальнасць не з'яўляецца чымсьці, што даравалі людзям эрудзіраваныя прафесары, каб вызваліць грамадства ад "нежаданых". Індывідуальнасць – неад'емная каштоўнасць, якая ідзе ад належнасці да чалавечай расы. Паводле Бібліі, гэтая частка істоты створана па вобразу Бога.

## Што навука кажа пра "значнасць"

Што сцвярджае "значнае" жыццё? Мысленчыя працэсы ў ненароджаных дзяцей з'яўляюцца навукова пацверджаным фактам. "Associated Press" паведаміла аб выніках даследавання, якое паказвае, што "дзеці пачынаюць навучацца сваёй будучай мове яшчэ да нараджэння". Яшчэ ў матчыным улонні, "плод чуе, успрымае, слухае і даведваецца нешта пра акустычную структуру" матчынай мовы[4].

"Newsweek" піша: "Жыццё ва ўлонні адчыняе новыя межы для даследавання чалавечага развіцця, і першыя даследаванні гэтых межаў... прынеслі рэвалюцыйныя адкрыцці"[5]. Артыкул сцвярджае: "Абсалютна без аніякага перабольшвання, плод можна называць цудам спазнання, свядомасці і чуллівасці".

Таксама ў артыкуле сказана, што навукоўцамі было вызначана, што плод здольны адчуваць ужо ў другім трыместры[6]. Незвычайныя здольнасці ненароджаных дзетак фіксуюцца навукоўцамі на працягу вялікай колькасці год[7].

Ужо напачатку другога трыместра дзеткі рухаюць сваімі ручкамі, каб прыкрыць вочы ад яркага святла, якое праходзіць праз матчына цела. "Таксама плод адказвае на гукі такой высокай частаты, што дарослыя не здолелі б пачуць іх"[8]. Дзеткі чуюць гучную музыку і закрываюць свае вушкі ад гучных шумоў, што прыходзяць звонку. На сямнаццатым тыдні ў іх фіксуюць хуткія рухі вачэй падчас сну, што з'яўляецца прыкметай фазы хуткага сну і сведчыць, што дзеткі не толькі спя-

ць але і сняць сны[9]. Ці можам мы казаць, што нехта мае здольнасць сніць і пры гэтым не можа думаць?

Без сумненняў, познія аборты з'яўляюцца забойствам здольнай думаць і адчуваць чалавечай істоты. Напрыканцы другога трыместра "мазгавыя рэфлекторныя дугі развітыя на столькі ж, як і ў нованароджанага дзіцяці[10]. У Вялікабрытаніі законным з'яўляецца перапыненне цяжарнасці да 24 тыдняў. Падаецца неверагодным, што хоць нехта знаёмы з гэтымі фактамі, можа выступаць за ўзаконьванне такой практыкі.

Але ці раннія аборты лепш за познія? Нават у выпадку ранніх "хімічных абортаў", якія забіраюць жыццё яшчэ да ўзнікнення здольнасці думаць, смерць застаецца такой жа рэальнай і значнай. Жывое дзіця, якое б мела імя, сям'ю і жыццё, ніколі не будзе мець гэтага.

## Заганная этыка

Сінгер піша: *"Калі мы параўнаем сур'ёзна дэфектнае немаўля з іншымі жывёламі, для прыкладу сабакам або катом, мы заўжды ўбачым, што жывёлы маюць больш высокія рэальныя і патэнцыйныя здольнасці да рацыянальнасці, самаўсвядомасці, камунікацыі і ўсяго астатняга, што можна лічыць маральна значным"*[11].

Сінгер мяркуе, што індывідуальная чалавечая каштоўнасць грунтуецца на яго карыснасці для іншых: *"Калі смерць непаўнавартаснага дзіцяці прывядзе да нараджэння дзіцяці з лепшымі шанцамі на шчаслівае жыццё, агульная колькасць шчасця будзе большай, калі непаўнавартаснае дзіця забіць. Страта першага дзіцяці пераважваецца больш шчаслівым жыццём другога дзіцяці. Такім чынам, калі забойства дзіцяці, хворага на гемафілію, не будзе мець адваротнага ўплыву на іншых, у шырокім кантэксце, было б правільна забіць гэтае дзіця"*[12]. Калі Сінгер пачынаў выкладаць у Прынстанскім універсітэце, "Not Dead Yet" (Яшчэ не мёртвыя), група па

абароне правоў непаўнавартасных, выступіла з пратэстам. Яны былі пакрыўджаныя кнігамі Сінгера, у якіх ён казаў, што неабходна легалізаваць забойства непаўнавартасных немаўлят, а таксама дзяцей і дарослых з сур'ёзнымі кагнітыўнымі разладамі.

Логіка "за выбар" пачынаецца з аборту, але на ім не спыняецца. Калі становіцца прымальным забіць ненароджанае дзіця, тады больш ніхто слабы і кволы не можа быць у бяспецы. Ці жыццё непаўнавартаснага чалавека з'яўляецца значным? А што наконт старыкоў? Калі тыя, хто не могуць думаць, не заслугоўваюць жыцця, як наконт тых, хто думае няправільна?

Прафесар Чарльз Хартсхорн з Універсітэта Тэхаса туруе этыцы Сінгера: *"Канечне, немаўля не з'яўляецца ў поўнай ступені чалавекам. Я не надта падтрымліваю ідэю, што дзетазабойства – гэта проста яшчэ адна форма забойства. Асобы, якія ўжо функцыянальна з'яўляюцца асобамі ў поўным сэнсе гэтага слова, маюць больш важныя правы, чым гэтыя немаўляты"*[13].

## Ці хоць нехта ў бяспецы?

Дэвід Бунін лічыць, што аборт можна "крытыкаваць з маральнай кропкі гледжання", пры гэтым ён з'яўляецца "маральна дапушчальным". Аборт дапушчальны, паводле меркавання Буніна, таму што аборт мае магчымасць утварыць "усеагульнае шчасце"[14]. Як і Сінгер, Дэвід Бунін прапускае той факт, што тое суб'ектыўнае адчуванне шчасця (якое вызначаецца зручнасцю і пазбяганнем стрэсу або фінансавых цяжкасцяў) можа таксама быць дасягнута, калі пачаць забіраць жыцці ў іншых людзей, не толькі немаўлят. Калі ўжо нешта адзначаецца як маральна дапушчальнае з той нагоды, што яно можа прывесці да ўзнікнення шчасця, тады няма нічога, што не магло б падпасці пад гэтую катэгорыю.

За вялікай часткай дыскусій на тэму таго, што робіць жыццё значным, хаваецца ўтылітарызм. Ці з'яўляюцца людзі з ментальнымі і фізічнымі недахопамі або абяздоленыя людзі, для нас, людзей здаровых і моцных, карыснымі, або яны цяжар для нас? Як адзначыла адна з феміністскіх груповак, калі ненароджаныя дзеці – у небяспецы, тады ніхто не можа быць у бяспецы: *"Калі мы возьмем жывога члена віда Homo Sapiens і вывядзем яго за межы законнай абароны дзяржавай, мы створым глебу супраць дыскрымінацыі і для ўсіх астатніх. Асновай роўнага стаўлення закона з'яўляецца факт, што быць прадстаўніком віда дастаткова, каб быць членам чалавечай супольнасці, без адрознення паводле расы, полу, здароўю, узросту, ступені развіцця, стану залежнасці, месца пражывання і колькасці маёмасці*[15].

Аборты скіроўваюць нас на небяспечны курс. Мы можам хадзіць туды і сюды па гэтым слізкім шляху. Або мы можам дайсці да непазбежнага выніку гэтага шляху – да грамадства, у якім моцныя ў сваіх уласных інтарэсах вырашаюць, якія чалавечыя істоты будуць жыць, а якія памруць.

Біёлаг з Універсітэта Чыкага Леон Касс наступным чынам выказаўся пра напрамак развіцця сучаснай навукі і медыцыны: "Мы ўжо з'яўляемся сведкамі руйнавання ідэі, што чалавек – гэта нешта велічнае ці боскае, як стварэнне, надзеленае свабодай і годнасцю. І ясна, што калі мы дайшлі да таго, што ўспрымаем саміх сябе як груду мяса – у мяса мы і ператворымся"[16].

Гэта – свет, сфармаваны рыторыкай руху па абароне права на аборты.

Ці гэта той свет, у якім бы вы хацелі, каб раслі вашыя дзеці і ўнукі?

# Частка 3

# Жанчына



## ГЛАВА 8

# ЦІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АБОРТ ПРАБЛЕМАЙ ПРАВОЎ ЖАНЧЫНЫ?

Кэйт Міхельман, былая прэзідэнт NARAL (Нацыянальная асацыяцыя па адмене закона аб абортах), кажа: "Мы павінны нагадваць людзям, што аборт – гэта гарантыя права жанчын на ўдзел у сацыяльным і палітычным жыцці грамадства"[1]. Але цяжарная жанчына цалкам можа ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. А калі яна ўсё ж такі не можа, хіба выйсце ў тым, каб забіваць дзяцей, замест таго, каб перамяняць грамадства?

Як жанчына можа дасягнуць роўнасці, не кантралюючы сваё рэпрадуктыўнае жыццё? "Феміністкі за жыццё ў Амерыцы" адказваюць:

*"Перадумовы гэтага пытання, тыя ж самыя, што і перадумовы мужчынскага дамінавання на працягу тысячагоддзя: сама прырода робіць мужчын галоўнымі, а жанчын падпарадкаванымі. Медычныя тэхналогіі прапануюць вырашэнне для дасягнення роўнасці; але перадумова памылковая.... Гэта абраза для жанчыны казаць, што для таго, каб упісацца ў грамадства, ім неабходна памяняць сваю біялогію"[2].*

У сваім эсэ "Фемінізм: зачараваныя абортам" змагар за абарону навакольнага асяроддзя Розмары Ботчэр сцвярджае, што феміністкі рух прынізіў жанчын, выстаўляючы іх нібыта няздольнымі справіцца са стрэсам і ціскам цяжарнасці без забойства сваіх дзяцей[3].

Актывісты "за выбар" паслядоўна выступаюць супраць таго, каб да абортаў ставіліся як да звычайных аперацыяў, пры якіх неабходна інфармаваць пацыента пра прыроду ўмяшальніцтва і рызыкі. Не падобна, каб яны верылі, што жанчына здольная зрабіць разумны выбар, калі ёй прадаставяць усе факты.

Сэрын Фостэр, прэзідэнт “Феміністак за жыццё”, вельмі пераканаўча выказваецца ў сваёй кнізе “Справа «Феміністкі супраць абортаў»”. Яна кажа, што гістарычна першымі актывістамі супраць абортаў былі жанчыны. Іронія ў тым, што “антыабортавае заканадаўства, якое першыя феміністкі вельмі старанна распрацоўвалі для абароны жанчыны і дзіцяці, было знішчана вырашэннем па справе «Рой супаць Вэйда» праз 100 гадоў”[4].

## Феміністкая гісторыя

Сьюзан Б. Энтані выступала за правы жанчын яшчэ тады, калі жанчынам не дазвалялі галасаваць. Яна называла аборт “забойствам дзіцяці” і разглядала яго як эксплуатацыю і маці, і дзіця. Энтані пісала: “Я смуткую ад жахлівага злачынства, якім ёсць забойства дзіцяці.... Не істотна, што было матывам: імкненне да бесклапотнасці або жаданне ахаваць ад пакут ненароджанае нявіннае дзіця – жанчына, якая гэта зрабіла, да агіднасці вінаватая”[5].

Газета, якую выдавала Сьюзан Энтані, “The Revolution”, сцвярджала наступнае: “Калі жанчына знішчае жыццё ненароджанага дзіцяці – гэта знак таго, што ці то праз адукацыю, ці то праз абставіны, але жанчына апынулася пацярпелай”[6].

Праз некалькі дзесяцігоддзяў на змену Энтані і іншым феміністкам, якія выступалі супраць абортаў, прыйшло новае пакаленне. Найбольш вядомай была Маргарэт Сэнджэр, якая лічыла аборт дзейсным сродкам эўгенікі, а таксама эканамічнага і сэксуальнага вызвалення. Калі пасля Халакосту эўгеніка патрапіла ў няласку, арганізацыя Сэнджэр сышла ў падполле, а пазней з’явілася як Амерыканская федэрацыя планаванага бацькоўства (Planned Parenthood Federation of America)[7]. Сэнджэр і іншыя паслядоўнікі Сьюзан Энтані намагаліся ўвязаць пытанне абортаў з юрыдычнымі аспектамі правоў жанчын.

Доктар Бернард Натансон распавядаў, як у 1960 гадах ён разам са сваімі паплечнікамі распрацоўваў стратэгіі па пра-

соўванні абортаў. Яны наўмысна прывязвалі права на аборт з жаночым пытаннем, каб права на аборт разглядалася не самастойна, а ў якасці правоў жанчыны[8]. Аборты "выехалі" на рэйках правоў жанчын.

Эліс Пол была чалавекам, які рабіў накіды знакавага дакумента для фемінізму ў ЗША – перашапачатковай версіі 19-й папраўкі да Канстытуцыі ЗША, якая ўводзіла актыўнае выбарчае права для жанчын. Але Эліс Пол называла аборт "крайняй эксплуатацыяй жанчыны"[9].

Адна феміністка назвала спробу "ажаніць" фемінізм і аборты "феміністычным тэрарызмам". Паводле ейных слоў, гэта прымушае феміністак "жадаць забіць за тое, у што ты верыш"[10]. У сваёй публікацыі "Амерыканскія феміністкі", прадстаўніцы руху "Феміністкі за жыццё", змясцілі прыгожы твар дзіцяці і запыталіся: "Хіба гэта твар ворага?" Яны сцвярджаюць, што стаяць на двухсотгадовай гісторыі фемінізму, які выступаў за жыццё, і што толькі з 1970-х гадоў жанчыны пачалі вітаць аборты[11].

Апытанне амерыканцаў паказвае, што жанчыны больш чым мужчыны падтрымліваюць права ненароджанага дзіцяці на жыццё[12]. Па праўдзе, у ЗША (дарэчы, як і ў многіх іншых краінах) "найбольш спрыяльна да абортаў ставяцца белыя мужчыны ва ўзросце ад 20 да 45 гадоў"[13]. На сайце Таварыства абароны ненароджанага дзіцяці (SRUC) апублікавана даследаванне, якое паказвае, што ў 1989 г. толькі 30% вырашэнняў прымалася самой цяжарнай жанчынай; у 33% выпадкаў вырашэнне прымаў партнёр жанчыны[14]. Дакладней «група, якая найбольш паслядоўна выступае «за выбар» - гэта самотныя мужчыны»[15]. Іронія ў тым, што аборт ператварылі ў адно з пытанняў правоў жанчыны, нягледзячы на тое, што менавіта аборт падтрымлівае мужчынскую безадказнасць і нездольнасць клапаціцца аб жанчыне і дзіцяці. Хіба не трэба заахвочваць мужчыну казаць жанчыне, якая ад яго зацяжарыла: "Я буду побач дзеля нашага дзіцяці. Я зраблю ўсё, што змагу. А калі ты гэтага хочаш, я буду побач з табой таксама"?

# Адбор паводле пола

Ёсць нейкая злая іронія ў тым, што фемінізм, абараняючы аборты, падтрымаў самы сур'ёзны сродак пазбаўлення жанчын самага галоўнага права – права на жыццё.

Аборт стаў першым сродкам знішчэння вялікай колькасці "нежаданых" асоб жаночага полу па ўсім свеце. Нядаўняе даследаванне, праведзенае ў тузіне вёсак Індыі, выкрыла жахлівую статыстыку: з 10000 чалавек насельніцтва толькі 50 – дзяўчынкі[16]. Іншыя дзяўчынкі – тысячы – былі забітыя з дапамогай абортаў. Апынулася, што ў Бамбее з 8000 дзяўчынак, пол якіх быў вызначаны пасродкам пункцыі плоднага пузыра, была народжана толькі адна. Астатніх забілі праз аборт[17]. Сёння ў Індыі, асабліва ў некаторых паўночных раёнах, на 1000 мужчын прыходзіцца 793 жанчыны, а ў некаторых частках нават 600. Індыя згубіла каля 40 мільёнаў дзяўчын. І хаця аборты на падставе полу дзіцяці тэхнічна лічацца незаконнымі, такім чынам забіваюць каля 5 мільёнаў ненароджаных дзяўчынак штогод[18].

У артыкуле, прысвечаным абортам па палавой прыкмеце, змешчаным на www.slate.com, Вільям Сэлетан спасылаецца на даследаванне, апублікаванае ў 2009 г. у Брытанскім медычным часопісе.

Даследаванне базуецца на дадзеных пра 5 мільёнаў кітайскіх дзяцей, народжаных з 1985 па 1989 гады, калі суадносенне дзяўчынкі/хлопчыкі было нармалёвым 100 на 108. Але ўжо сярод дзяцей, народжаных з 2000 да 2004 года, на 100 дзяўчынак прыходзіліся 124 хлопчыкі. У падсумаванні гаварылася, што па стане на 2005 год, хлопчыкаў ва ўзросце да 20 год было на 32 мільёны болей, чым дзяўчынак таго ж узросту[19].

Пункцыя плоднага пузыра ў Злучаных Штатах таксама выкарыстоўваецца для вызначэння полу дзіцяці. "Медычныя сусветныя навіны" (Medical World News) распавядалі пра даследаванне, у якім 95-ці мамам паведамлялі пра пол дзіцяці. 53 былі хлопчы-

камі, 46 – дзяўчынкамі. Толькі адна мама вырашыла абартаваць хлопчыка, у той жа час 29 зрабілі аборт дзяўчынкам[20].

Сёння аборты забіваюць больш дзяўчынак, чым хлопчыкаў. Па сутнасці, забіць ненароджаную дзяўчынку – гэта забіць маладую жанчыну. Не можа быць роўных правоў для жанчын, пакуль няма роўных правоў для ненароджаных жанчын.

## ГЛАВА 9

# ЦІ МАЕМ МЫ ПРАВА ВЫБІРАЦЬ, ШТО РАБІЦЬ З НАШЫМ ЦЕЛАМ?

Прыхільнікі абортаў сцвярджаюць: "Кожная жанчына мае права выбіраць, што рабіць з яе ўласным целам". Ёсць нейкая злая іронія ў тым, што ў выніку аборту не менш за 97 648 жанчын у Англіі і Уэльсе штогод не атрымліваюць права выбіраць, што рабіць са сваімі целамі. (Гэта лічба – колькасць паловы абартаваных дзяцей; другая палова – гэта хлопчыкі.) Дзяўчынка, забітая падчас аборту, больш не мае жыцця, выбару, або цела, якое яна магла б кантраляваць.

Чалавеку не дазваляюць з'яўляцца аголеным у публічных месцах. Ёсць законы супраць прастытуцыі і ўжывання наркотыкаў. Большасць з нас пагаджаецца з гэтымі законамі, нягледзячы на тое, што яны абмяжоўваюць нашую свабоду рабіць некаторыя рэчы з нашымі целамі. Мая рука – гэта частка майго цела, але я не маю права выкарыстаць яе, каб ударыць, скрасці або параніць дзіця.

## Права выбару

Прадстаўляючы пазіцыю "за жыццё" ў школьных інтэрнатах, звычайна я пачынаю наступным чынам: "Я прытрымліваюся пазіцыі "за выбар". Таму я веру, што кожны мужчына мае права гвалціць жанчыну, калі гэта ягоны выбар. У рэшце рэшт, гэта ягонае цела, і ў нас няма права дыктаваць яму, што можна з гэтым целам рабіць, а што нельга."

Пасля таго, як першы шок трошку сціхне, я прашу дзяцей паказаць мне, у чым памылка маёй аргументацыі. Яны ўказваюць, што абараняючы права мужчыны выбіраць, я ігнарую тую шкоду, якая наносіцца невінаватай жанчыне, чые правы

парушаюцца. Тады я кажу: "Хочаце сказаць, што вы супраць свабоднага выбару?" Пасля таго, як яны прыводзяць свае ідэі, я звычана працягваю: "Атрымліваецца, што калі я пакажу вам, што выбар жанчыны на карысць аборту шкодзіць або забівае іншую чалавечую істоту, вы больш не будзеце трымацца пазіцыі "за выбар" адносна абортаў?"

Я спадзяюся, што святло запаліцца, і яны прыслухаюцца да свайго здаровага сэнсу, які цудоўна працуе, але чамусьці не ў дачыненні да праблемы абортаў.

Абсурдна абараняць канкрэтны выбар на падставе таго, што гэта выбар. Фраза, якая так прыгожа гучыць – "права выбару" – ігнаруе відавочнае: *не любы выбар дапушчальны.* На справе – і тут пагодзіцца і большасць хрысціян і нехрысціян – некаторы выбар вядзе да поўнага зла. Бывае выбар добры, астатні – дрэнны. З-за гэтага мы не можам у роўнай ступені быць "за выбар" і "за жыццё". Гэтаксама як мы павінны быць "за дабро" і "супраць зла".

## Часткова "за выбар"

Усе мы падтрымліваем свабоду выбару, калі гутарка вядзецца пра тое, дзе людзям жыць, на якім аўтамабіле ездзіць, якую ежу есці і пра тысячы іншых пытанняў асабістай перавагі. Мы гэтаксама "за выбар", калі справа датычыцца рэлігіі, палітыкі і ладу жыцця, нават калі людзі абіраюць погляды і паводзіны, адрозныя ад нашых.

Але ёсць досыць пытанняў, адносна якіх вы не выступаеце "за выбар". Напрыклад, ці мае нехта права нападаць на вас, абрабоўваць вас або ўрывацца ў ваш дом, красці вашую машыну, махлярыць у бізнэс-пагадненнях. Гэта самавідавочна, што людзі маюць *свабоду* рабіць гэты выбар, але гэта не значыць, што ў іх ёсць *права* рабіць яго.

Калі мы выступаем супраць права абіраць гвалт або жорсткае стаўленне да дзяцей, мы не выступаем супраць чаго-

сьці правільнага, мы выступаем супраць няправільнага. Ад таго, што мы так робім, мы не становімся зашоранымі або фанатыкамі.

Нехта з руху "за выбар", які насамрэч з'яўляецца рухам за аборты, пасьпяхова захапіў слова "выбар". "Выбар" стаў эўфемізмам для аборту, такім чынам выступаць супраць абортаў *стала азначаць* – выступаць супраць выбару. Актывісты "за жыццё" не павінны выступаць супраць выбару – гэта бітва, у якой мы не можам перамагчы, ды і ўвогуле не павінны змагацца. Мы не павінны дазволіць прыхільнікам абортаў засноўвацца на выбары. Замест гэтага кожны раз, калі мы чуем "за выбар", мы павінны запытваць у людзей: "А які выбар вы маеце на ўвазе?" Выступаючы супраць абортаў, мы не выступаем супраць выбару як такога, мы выступаем супраць *аднаго канкрэтнага выбару* – супраць забойства дзіцяці.

Варта ўзгадаць адно пытанне, папулярнае сярод прыхільнікаў абортаў: "Калі вы не можаце мне даверыць выбар, як вы можаце даверыць мне дзіця?" Гэта пытанне лічыцца "забойцам дыскусіі". Але звярніце ўвагу, як "выбар" замяняе "аборт". Калі ж мы ўжывем слова, якое правільна апісвае рэчаіснасць, пытанне ператворыцца ў наступнае: "Калі вы не давяраеце мне забойства дзіцяці, як вы можаце даверыць мне яго нараджэнне?" Ну, як вам гэта?!

## А што наконт выбару для ахвяры?

Адна жанчына неяк сказала: "Пасля таго, як жанчына зацяжарыла, яна не можа выбіраць станавіцца маці або не. Яна ўжо з'яўляецца ёю. Адзіны выбар, які ёй застаецца, гэта вынасіць сваё дзіця жывым ці мёртвым"[1].

Рабаўладальнікі выступалі за выбар. Яны рабілі акцэнт на фізічных адрозненнях, каб апраўдаць сваю перавагу над прыгнечанымі. Яны казалі: "Ты не абавязаны валодаць рабамі, але не трэба казаць нам, што мы не можам імі валодаць." Людзей, якія імкнуліся прывесці рабаўладальніцтва ў незаконны ста-

тус, абвінавачвалі ў тым, што яны – супраць выбару, супраць свабоды, што яны спрабуюць навязаць сваю мараль іншым[2].

Любы рух прыгнёту і эксплуатацыі – ад рабства да прастытуцыі, распаўсюду наркотыкаў і абортаў – вызначаў сябе як рух "за выбар". Падобным чынам яны вызначалі апазіцыйныя сабе рухі, якія прапаноўвалі спачуванне і вызваленне, рухамі супраць свабоды выбару.

Прыхільнікі пазіцыі "за выбар" заўжды чамусьці выпускаюць з-пад увагі правы ахвяры.

## ГЛАВА 10

# ЦІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АБОРТ ЧАСТКАЙ ПРАВА НА НЕДАТЫКАЛЬНАСЦЬ ПРЫВАТНАГА ЖЫЦЦЯ?

"Аборт не з'яўляецца справай кагосьці яшчэ. Кожны мае права на прыватнае жыццё."

Нягледзячы на тое, што ёсць шэраг законаў, якія абараняюць прыватнае жыццё, традыцыйна законы Злучанага Каралеўства не мелі адасобленнага "права на прыватнае жыццё" (гл. www.yourrights.org.uk). Больш за тое, права на прыватнае жыццё ніколі не з'яўлялася абсалютным правам, але заўжды падпарадкоўвалася іншым правам.

Што б вы падумалі пра мужчыну, які стаў бы абараняць збіццё жонкі або жорсткае стаўленне да дзяцей, гаворачы: "Тое, што я раблю ў сваім прыватным жыцці, не датычыцца нікога, акрамя мяне"?

Яшчэ адно папулярнае сцвярджэнне: "Аборт – гэта прыватнае вырашэнне паміж жанчынай і яе доктарам".

Дактары вучацца медыцыне, але іхнія меркаванні аб маралі не настолькі ж аўтарытэтныя, наколькі іхнія медычныя дыягназы (якія часам таксама бываюць памылковымі). Мноства дактароў – гэта сумленныя людзі, якія ставяць дабрабыт чалавека па-над выгодай і грашыма. Але, нажаль, некаторыя дактары не з'яўляюцца надзейнымі маральнымі павадырамі.

Гэтыя дактары здольныя да сутнасна злых суджэнняў, што яскрава паказалі многія нямецкія дактары на працягу Другой сусветнай вайны. Роберт Джэй Ліфтон у сваёй вельмі моцнай кнізе "Нацысцкія дактары" прыводзіць задакументаваныя факты таго, як разумныя высокапрафесійныя

дактары прымалі ўдзел у жорсткіх смертаносных аперацыях і ў эксперыментах над бездапаможнымі дзецьмі з шакуючай лёгкасцю[1]. Яны былі медычным персаналам з найлепшай падрыхтоўкай ва ўсёй тагачаснай Еўропе, але яны згубілі свой маральны компас.

## Пазбягаючы ганьбы

Многія маладыя жанчыны і іхнія бацькі хочуць пазбегнуць ганьбы з боку навакольных людзей.

Не важна, якія ў кагосьці погляды на сэкс па-за шлюбам; цяжарнасць сама па сабе не з'яўляецца няправільнай, нават калі сэксуальны акт, які прывёў да цяжарнасці, такім быў. Ніхто не павінны ставіцца да маці як да "дрэннай дзеўкі" або ціснуць на яе, каб яна "вырашыла сваю праблему", забіўшы сваё дзіця. Мы павінны любіць яе і дапамагаць ёй падчас цяжарнасці, прапануючы ёй падтрымку як у выпадку, калі яна вырашыць выхоўваць дзіця самастойна, так і калі яна абярэ ўсынаўленне. Які б варыянт яна не абрала, мы павінны падтрымліваць яе.

Заўсёды, калі я бачу незамужнюю жанчыну, якая носіць дзіця, мая першая рэакцыя – захапленне. Я ведаю, што яна магла б абраць "хуткае вырашэнне", каб ніхто нават і не ведаў, але замест гэтага яна вырашыла пакінуць жыццё дзіцяці.

Сэкс да шлюбу мае сур'ёзныя наступствы, нават калі не лічыць нежаданыя цяжарнасці. Па гэтай прычыне мы павінны натхняць нашых маладых людзей, каб яны ўтрымліваліся ад сэксуальных адносінаў да шлюбу. Устрыманне кажа "не" таму, што раніць вас, і кажа "так" таму, што найлепш для вас. Але нават калі ён і меў месца, з сэксу да шлюбу можна вынесці ўрок і не вяртацца да яго зноў. Забойства невінаватага дзіцяці праз аборт – справа значна больш сур'ёзная і трывалая. Атрымліваецца, што адзін чалавек плаціць за памылкі іншага. Больш за тое, гэта прымушае маладую жанчыну жыць з пачуццём віны

і стварае для яе яшчэ большую праблему, якую таксама трэба хаваць. Аборт можа часова схаваць праблему, але ён ніколі яе не вырашыць.

Аборт выхоўвае такое стаўленне да жыцця: "Мой камфорт і шчасце – перадусім, нават калі давядзецца грэбаваць правамі невінаватых асоб, каб дасягнуць гэтага". Такі падыход праяўляецца ў тысячах сітуацый – вялікіх і маленькіх – якія разам разрываюць маральную тканіну грамадства. (І ён ніколі не прыносіць шчасця, якое абяцае.)

Чыесці несправядлівыя або ганебныя абставіны не апраўдваюць забойства іншага чалавека.

## ГЛАВА 11

# ЦІ ШКОДЗІЦЬ АБОРТ ФІЗІЧНАМУ І ПСІХІЧНАМУ ЗДАРОЎЮ ЖАНЧЫНЫ?

“Аборт абсалютна праваліўся ў якасці сацыяльнай палітыкі, створанай каб дапамагаць жанчынам”, – піша Серын Фостэр, прэзідэнт арганізацыі “Феміністкі за жыццё” ў Амерыцы. – “Гэта адлюстраванне таго, што сярод нас ёсць знішчаныя жанчыны”[1].

Джоан Эпэлтан была актыўнай абаронцай абортаў у NOW (Нацыянальная арганізацыя жанчын) – найбуйнейшай феміністкай арганізацыі ў ЗША, а таксама працавала старшай медсястрой у Цэнтры абортаў Вірджыніі. Аднойчы яна запытала сябе, чаму аборт “з’яўляецца такім цяжкім вырашэннем для жанчыны, такой псіхалагічнай траўмай, калі гэта так натуральна? Калі гэта правільна, тады чаму гэта так складана?”

Эпэлтан казала сабе: “Я так добра кансультую гэтых жанчын; яны сапраўды ўпэўненыя ў сваім вырашэнні. Чаму яны зноўку вяртаюцца, праз месяцы і годы, псіхалагічна знішчаныя?”[2]

Мноства жанчын, якія з-за аборту атрымалі траўму, кажуць: “Я і не думала, што гэта можа адбыцца; ніхто не папярэджваў мяне пра такую рызыку”.

## Звычайныя ўскладненні

Выступаючы сведкам перад камітэтам Сената ў 2004 г., прафесар Элізабэт Шадзіган засведчыла, што “аборты павышаюць верагоднасць раку грудзей, прадляжання плацэнты, датэрміновых родаў і мацярынскага суіцыду... Статыстычна, усе віды ненатуральнай смерці сустракаюцца часцей сярод жанчын, якія рабілі аборт”[3].

Прынамсі, 49 даследаванняў паказваюць статыстычна значнае павелічэнне выпадкаў датэрміновых родаў і родаў дзяцей з нізкай вагой сярод жанчын, якія раней рабілі аборт. "Маленькая вага дзіцяці і датэрміновыя роды – найбольш важныя фактары рызыкі дзіцячай смяротнасці або пазнейшай інваліднасці, а таксама паніжаных кагнітыўных здольнасцяў і павышаных паводзінавых разладаў"[4].

Некаторыя жанчыны пасля аборту становяцца няздольнымі зацяжарыць. Верагоднасць заганаў развіцця ў наступных дзяцей таксама павышаецца з-за аборту[5]. Паказнік ранняй смяротнасці сярод немаўлят вышэй за нармальны ў 2-4 разы для жанчын, якія раней мелі аборт[6]. З-за таго, што аборт павышае верагоднасць наступных датэрміновых родаў, ускосна ён становіцца прычынай тысяч выпадкаў цэрэбральнага паралюшу ў Паўночнай Амерыцы[7].

Эктапічная цяжарнасць мае месца, калі выспяванне плода адбываецца па-за маткай, звычайна ў фалопіевых трубах. Такія цяжарнасці складаюць 12% мацярынскай смяротнасці, звязанай з цяжарнасцю. Міністэрства аховы здароўя і сацыяльных служб ЗША ажыццяўляла дваццацігадовае даследаванне эктапічных цяжарнасцяў. Яно паказала рост колькасці пазаматкавых цяжарнасцяў больш чым на 500% за той час, калі былі легалізаваныя аборты[8]. У Злучаным Каралеўстве з 2003 па 2005 год было 32 100 пазаматкавых цяжарнасцяў, якія прывялі да дзесяці смерцяў сярод маці[9].

Даследаванні сведчаць, што рызыка пазаматкавай цяжарнасці ў два разы вышэйшая для жанчын, якія рабілі аборт аднойчы, і да чатырох разоў вышэйшая для жанчын, якія рабілі аборт два або болей разоў.[10] Сярод тых, хто перанес эктапічную цяжарнасць, 40% становяцца бясплоднымі, у астатніх рызыка перанесці яшчэ адну пазаматкавую цяжарнасць – 30%. Важна, што "толькі 33% жанчын з эктапічнай цяжарнасцю ў будучыні змогуць нарадзіць жывое дзіця"[11].

Цэнтр па кантролі хвароб паведамляе, што “ўскладненні, звязаныя з цяжарнасцю, такія як пазаматкавая цяжарнасць, штодзённа здараюцца ў 2000 жанчын”[12].

Запаленне тазавых органаў – інфекцыя, якая вядзе да ліхаманкі і няплоднасці. Даследчыкі пішуць, што “пра запаленне тазавых органаў – звычайнае, але сур’ёзнае ўскладненне аборту – паведамляецца ў 30% усіх выпадкаў”[13]. Даследаванне жанчын, якія рабілі аборт у першым трыместры, выявіла, што “жанчыны з постабортным запаленнем тазавых органаў маюць значна вышэйшы паказчык... спантанных абортаў, другасных няплоднасцяў, дыспарэўніі і хранічных тазавых боляў”[14].

Прадляжанне плацэнты, няправільнае размяшчэнне плацэнты, выклікаецца “папярэднім матачным крывацёкам або пашкоджаннем”[15], у тым ліку абортам. Яно сустракаецца часцей ад 7 да 15 разоў сярод жанчын, якія рабілі аборт, у параўнанні з тым, хто яго ніколі не рабіў.[16] “Толькі пацверджаны паказчык неадкладных ускладненняў пры аборце складае не меней за 10%. У дадатак да гэтага, вывучэнне доўгатэрміновых ускладненняў выяўляе іх наяўнасць у 17% выпадкаў, а паказчык найбольш частых ускладненняў у выніку аборту дасягае ад 25% да 40%.[17]

Жанчыны, якія мелі адзін аборт, удвая павышаюць рызыку раку шыйкі маткі, у той час як жанчыны, якія мелі два і болей абортаў, павышаюць верагоднасць захворвання ў пяць разоў. Падобнае павышэнне рызыкі для аднаразовых і шматразовых абортаў было адзначана і для раку яечнікаў і печані.[18]

У сваім разгорнутым даследаванні Джоэл Брайнд, прафесар кафедры эндакрыналогіі ва ўніверсітэце горада Нью-Ёрк, зрабіў наступныя высновы: “Адзіны фактар рызыкі раку малочнай залозы, які можна пазбегнуць, – гэта аборт.”[19] Жанчына, якая мела аборт, павышае рызыку захворвання на рак малочнай залозы мінімальна на 50%, максімальна – на 300%.[20]

# Звычайныя псіхалагічныя ўскладненні

Дзясяткі даследаванняў звязваюць з абортамі сэксуальную дысфункцыю, рост агіды да сэксу, страту інтымнай блізкасці, раптоўнае пачуццё віны, пазашлюбныя сувязі, посттраўматычны стрэсавы разлад, падваенне асобы, песімізм, жорсткае стаўленне да дзяцей, нядбайнасць, рост ужытку алкаголю, наркатычную залежнасць[21]. Даследаванне Інстытута Эліота (Каліфорнія) паказвае, што верагоднасць наркатычнай залежнасці ў 5 разоў вышэй для жанчын, якія рабілі аборт[22].

Спецыяліст па постабортнай рэабілітацыі Дэвід Рэардон піша: *"У даследаванні постабортавых пацыентаў толькі на працягу 8 тыдняў пасля аборту даследчыкі высветлілі, што 44% з іх скардзілася на нервовы разлад, 36% мелі праблемы са сном, 31% шкадавалі аб сваім вырашэнні, а 11% сямейны доктар прапісаў псіхатропныя лекі"*[23]. Гэтыя дадзеныя асабліва важныя, калі ўлічыць, што ў некаторых жанчын, наступствы могуць не выяўляцца на працягу некалькіх год. Але наяўнасць такіх арганізацый, як "Жанчыны, эксплуатаваныя абортамі" (якія маюць больш за 30 тысяч членаў і больш за 200 аддзяленняў у Злучаных Штатах, а таксама філіялы ў Канадзе, Нямеччыне, Ірландыі, Японіі, Аўстраліі, Новай Зеландыі і Афрыцы[24]), бясспрэчна сведчыць пра псіхічныя і эмацыйныя траўмы незлічонай колькасці жанчын, якія перанеслі аборт.

Я чытаў у адной газеце рэдактарскую калонку, у якой даводзілася, што аборт – гэта проста яшчэ адна хірургічная аперацыя, якая нічым не адрозніваецца ад чысткі канала або ад выдалення апендыкса. Але тады чаму людзі праз 20 год не ўзгадваюць дзень, калі ім выразалі апендыкс? І дзе тады ўсе групы падтрымкі для тых, каму запламбавалі канал?

Многія мужчыны таксама атрымліваюць душэўную траўму з-за свайго ўдзелу ў вырашэнні рабіць аборт і страты дзіцяці[25,26].

## Смяротнасць ад легальных абортаў

Даследаванне смяротнасці, звязанай з цяжарнасцю, апублікаванае ў Амерыканскім часопісе акушэрства і генікалогіі, высветліла, што паказчык смяротнасці пры абортах у 2,95 разы вышэйшы ў параўнанні з цяжарнасцямі, даношанымі да канца тэрміна[27].

Цэнтр кантролю захворванняў паведаміў пра 10 смярцей, звязаных з абортамі ў 1998 г.;[28] але паводле таго ж самага даследавання, гэта вельмі заніжаная статыстыка. Насамрэч, клінікі абортаў нічога не атрымаюць, але шмат чаго згубяць, калі пачнуць даваць інфармацыю на гэты конт[29]. Што таксама ўскладняе задачу па падліку колькасці лятальных зыходаў, звязаных з абортамі, дык гэта той факт, што большасць смярцей адбываецца не падчас аборту, а пасля яго. З-за гэтага, мноства другасных прычын звычайна ўказваецца як прычына смерці.

*Для прыкладу, маці страціла шмат крыві падчас пераліванння, заразілася гепатытам і памерла праз некалькі месяцаў. Якая афіцыйная прычына смерці? Гепатыт. Якая фактычная прычына? Аборт. Перфарацыя маткі прывяла да ўнутрытазавага абсцэсу, сэпсісу (атручванне крыві) і смерці. Афіцыйны даклад у якасці прычыны смерці можа назваць унутрытазавы абсцэс або септыцэмію. Аборт нават узгаданы не будзе. Аборт выклікаў пашкоджанне фалопіевых труб. Праз шмат год у жанчыны здарылася пазаматкавая цяжарнасць і яна памерла. Прычынай смерці будзе названая пазаматкавая цяжарнасць. А якая сапраўдная прычына? Аборт*[30].

Даследаванне, апублікаванае ў Паўднёвым медычным часопісе, сцвярджае, што "жанчыны, якія робяць аборт, маюць значна большую рызыку смерці, чым жанчыны, якія нараджаюць"[31]. Сайт "Таварыства па абароне ненароджаных дзяцей" таксама паведамляе, што жанчыны, якія здзейснілі аборт, маюць у 6 разоў большую рызыку суіцыду, чым сярэднестаты-

стычная жанчына; а для падлеткаў пасля абортаў гэтая рызыка вырастае ў 10 разоў[32].

Энцыклапедычная праца "Здароўе жанчыны пасля аборту", якая спасылаецца на больш чым 500 артыкулаў у медычных часопісах, паказвае шкодныя ўплывы аборту на жанчыну[33]. Калі нехта яшчэ сумняецца ў тым, што аборт выклікае сур'ёзную доўгатэрміновую шкоду для жанчыны, хай прачытае гэтую працу, поўную пераканаўчых доказаў.

**Што кажуць жанчыны**

Вось вынікі апытання, праведзеным сярод жанчын, якія перажылі постабортавыя ўскладненні:

**1.** Больш за 90% сказалі, што яны не атрымалі дастаткова інфармацыі для прыняцця ўзважанага вырашэння.

**2.** Больш за 80% сказалі, што наўрад ці яны зрабілі б аборт, калі б іх так моцна не падштурхоўвалі зрабіць аборт іншыя людзі, у тым ліку іх кансультанты па абортах.

**3.** 83% сказалі, што яны б вынасілі дзіця, калі б адчулі падтрымку ад сваіх хлапцоў, сваякоў і іншых людзей, якія мелі важную ролю ў іх жыцці[34].

Кожная жанчына заслугоўвае нешта большае, чым аборт.

## ГЛАВА 12

# ЦІ З'ЯЎЛЯЕЕЦЦА АБОРТ ПРАВІЛЬНЫМ, КАЛІ ЦЯЖАРНАСЦЬ СТВАРАЕ РЫЗЫКУ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ МАЦІ?

Ці можа быць апраўданы аборт, калі жыццю або здароўю жанчыны пагражае небяспека з-за цяжарнасці або родаў? Перадусім, сітуацыя, калі для выратавання жыцця маці патрэбны аборт, з'яўляецца неверагодна рэдкай. Доктар С. Эверэт Куп (у свой час – галоўны дзяржаўны хірург Злучаных Штатаў) сцвярджаў, што за свае 36 гадоў практыкі ў якасці дзіцячага хірурга ён ні разу не сутыкнуўся з сітуацыяй, калі патрабавалася пазбавіць ненароджанага малютку жыцця, каб выратаваць жыццё маці. На яго думку, выкарыстанне гэтага аргумента для апраўдання абортаў – не болей чым дымавая заслона. Доктар Ландрум Шэтлэс сцвярджае, што менш за 1% усіх абортаў робіцца для выратавання жыцця маці[1].

## Выратаваць жыццё, якое можна выратаваць

Жанчына з заражэннем крыві можа мець непажаданыя рэакцыі арганізма і іншыя значныя клопаты, напрыклад, магчыма, ёй будзе неабходна правесці ў ложку большую частку цяжарнасці. Гэта, канечне, цяжка, але звычайна не пагражае жыццю. У такой сітуацыі аборт "па прычынах здароўя" будзе не для захавання жыцця, а для знішчэння жыцця.

Аднак, калі ў маці рак маткі, які хутка развіваецца, аперацыя па выдаленні пухліны можа прывесці да страты дзіцяці.

Пры эктапічнай цяжарнасці дзіця развіваецца па-за маткай. У дзіця няма шанцаў выжыць, таму, магчыма, яго трэба выдаліць дзеля захавання жыцця маці. Гэтыя сітуацыі поўныя трагізму, але нават калі адно жыццё можа быць страчана, жыццё, якое можна выратаваць, павінна быць выратавана. Больш чым у палове выпадкаў гэтае жыццё – жыццё маці. Бываюць вельмі рэдкія сітуацыі, калі на позніх тэрмінах цяжарнасці жыццё маці ўжо немагчыма выратаваць, затое можна захаваць дзіця. Зноўку паўтаруся: адно выратаванае жыццё лепей за два згубленыя.

Адны нашыя сябры апынуліся ў сітуацыі, калі выдаленне небяспечнай для жыцця і хуткарослай ракавай пухліны павінна было прывесці да смерці іх ненароджанага дзіцяці. Тэрмін цяжарнасці быў занадта малы, так што дзіця не паспела б развіцца дастаткова для жыцця па-за матчыным улоннем. Аперацыю зрабілі. Але гэта ані ў якім сэнсе не было абортам. Мэтай аперацыі было не забойства дзіцяці, а выратаванне жыцця маці. Смерць дзіцяці стала трагічным, калі можна так сказаць, пабочным эфектам намаганняў па выратаванні жыцця. Бясспрэчна, гэта было дзеянне “за жыццё”, бо выступаць “за жыццё” не значыць быць толькі за жыццё дзіцяці. Гэта таксама быць і за жыццё маці.

## ГЛАВА 13

# ЦІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АБОРТ ПРАВІЛЬНЫМ, КАЛІ ЦЯЖАРНАСЦЬ СТАЛА ВЫНІКАМ ЗГВАЛТАВАННЯ АБО ІНЦЭСТУ?

Даследаванні Інстытута Гутмахера, важнага даследчага цэнтра ў лагеры "за выбар", паказваюць, што пры сэксе па ўзаемнай згодзе двух плодных людзей верагоднасць зацяжарыць складае 3%. Паводле гэтых жа крыніц, пры згвалтаванні ўзнікаюць іншыя фактары, якія зніжаюць гэтую верагоднасць для ахвяр[1]. На працягу менструальнага цыклу, жанчына бывае плоднай толькі ад трох да сямі дзён, а фізічная і псіхалагічная траўма ад згвалтавання робіць апладненне вельмі складаным. У Злучаным Каралеўстве цяжарнасці ў выніку згвалтавання складаюць вельмі маленькі працэнт, гэта сапраўды вельмі рэдкі выпадак[2].

## У чым сапраўдная праблема?

Адкуль прыходзіць гэтае няправільнае ўяўленне пра тое, што вялікая колькасць абортаў становіцца вынікам згвалтавання? Часам маладыя напужаныя жанчыны прыпісваюць сваю цяжарнасць гвалту, каб пазбегнуць асуджэння. Маладая жанчына Норма МакКорвэй – тая самая "Рой" з працэсу "Рой супраць Вэйда" – калісьці выклікала спачуванне суда і сродкаў масавай інфармацыі, паколькі ўсе палічылі яе ахвярай гвалту. Аднак праз шмат гадоў яна прызналася, што насамрэч схлусіла, і яе не згвалцілі[3]. Дарэчы, пазней МакКорвэй стала шчырай актывісткай руху "за жыццё" і нават прасіла Вярхоўны Суд ЗША пераглядзець і ануляваць вырашэнне па справе "Рой супраць Вэйда"[4].

Каб адвесці ўвагу ад большасці абортаў, актывісты руху "за выбар" факусуюцца на згвалтаванні, бо яно заўжды выклікае спачуванне. Іх частая спасылка на гэтыя сітуацыі пакідае ілжывае ўражанне, што цяжарнасць у выніку згвалтавання – звычайная з'ява, а не рэдкасць.

У нас ёсць блізкая сяброўка, якая была згвалтаваная і зацяжарыла. З-за абставінаў, гадаваць дзіця было не лепшым вырашэннем для яе. Яна аддала дзіця на ўсынаўленне ў хрысціянскую сям'ю. Наша сяброўка перыядычна кантактуе з гэтай сям'ёй і яе дзіцём. Вырашэнне не было простым, яе пакуты і боль былі неверагоднымі. Але яны шчодра перакрыліся радасцю ад таго, што яе дзіця жыве і яго любяць.

У адной праграме на тэлебачанні, прысвечанай праблеме абортаў, мне давялося пачуць словы чалавека, які выказваўся наконт дзіця, зачатага пры згвалтаванні: "Нішто ў ягонай прыродзе не мае аніякіх правоў, таму што ён прадукт гвалту". Але якім чынам прырода гэтага дзіцяці адрозніваецца ад прыроды любога іншага дзіцяці? Хіба некаторыя дзеці больш вартыя жыць з-за таго, што іх бацькі лепшыя людзі? І чаму актывісты "за выбар" заўжды кажуць, што ненароджанае дзіця належыць маці, а не бацьку, пакуль яно не апынаецца вынікам гвалту? Тады дзіця раптоўна пачынае разглядацца як бацькава, а не матчына.

Сутнасць не ў тым, *як* было зачатае дзіця, а ў тым што яно *было зачатае.* Яно не з'яўляецца ганебным "прадуктам згвалтавання", яно – унікальнае і цудоўнае стварэнне Бога.

## Зачатыя ў інцэсце

Інцэст – жахлівае злачынства. Вінаватыя павінны быць пакараныя. Таксама трэба зрабіць усё, каб пазбавіць дзяўчыну ад прысутнасці сваякоў, якія яе згвалцілі. Праблема – гэта гвалтаўнік, а не дзяўчына або яе дзіця. Вырашэнне – гэта ўмяшальніцтва, абарона і працяглая асабістая дапамога, а не за-

бойства невінаватага дзіцяці. Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, дэфекты плода – з'ява рэдкая ў такіх сітуацыях. Але нават калі дзіця і мае нейкія абмежаванні, яно ўсё адно заслугоўвае жыццё.

Чаму трэба забіваць асобу А з-за таго, што асоба Б згвалціла або прымусіла да сэксуальных адносінаў яе маці? Калі ваш тата здзейсніў злачынства, ці павінны вы быць зняволеныя за гэта? Калі б сёння вы даведаліся, што ваш біялагічны бацька калісьці згвалціў вашу маці, ці адчулі б вы, што больш не маеце права жыць? Аднойчы жанчына пачула ад мяне гэтае пытанне і са слязьмі падышла да мяне. Яна сказала: "Маю маці згвалцілі, калі ёй было 13. Яна нарадзіла мяне і адразу аддала на ўдачарэнне. Кожны раз, калі я чула, што аборт у выпадку гвалту – гэта нармальна, я думала: "Тады, атрымліваецца, я не маю права жыць?!"

Давайце пакараем гвалтаўніка і разбэшчвальніка, а не іхніх ахвяр. Такая жанчына – не сапсаваны тавар. Яна ў прынцыпе не "тавар", а цудоўнейшая істота, годнасць і каштоўнасць якой не можа адабраць нават самае агіднае дзеянне. Гэтаксама і такое дзіця – не шкодная пухліна, якую трэба выдаліць, але жывая чалавечая істота.

## "Аборт змякчае траўму ад гвалту"

Феміністкі "за жыццё" кажуць: "Некаторыя жанчыны распавядаюць, што пакутуюць ад постабортнай траўмы яшчэ доўга пасля таго, як іх перастае непакоіць траўма ад згвалтавання"[5]. Цяжка прыдумаць горшую тэрапію для згвалтаванай жанчыны, чым віна і непакой ад таго, што ёй давялося забіць сваё дзіця. Аднойчы яна зразумее гэта, а людзей, якія ёй раілі зрабіць аборт, хутчэй за ўсё, не будзе побач, каб дапамагчы ёй перанесці боль і адчуванне віны.

У сваёй кнізе "Ахвяры і пераможцы" Дэвід Рэардон і яго суаўтары прыводзяць сведчанні 192 жанчын, якія зацяжарылі ў

выніку згвалтавання, і 55 дзяцей, якія былі зачатыя праз сэксуальнае злачынства. Калі ахвяры гвалту кажуць самі за сябе, іх стаўленне да абортаў амаль адзінадушнае, і яно радыкальна адрозніваецца ад таго, што можна было б чакаць.

*Амаль усе жанчыны, апытаныя ў гэтым даследаванні, сказалі, што шкадуюць аб абортах, якія яны зрабілі па выніку згвалтавання або інцэсту. Больш за 90% рэспандэнтаў сказалі, што паспрабавалі б адгаварыць іншых ахвяр сэксуальнага гвалту ад аборту. З іншага боку, сярод жанчын, якія зацяжарылі ў выніку згалтавання або інцэсту і вынасілі дзіця, ніводная не выказала шкадавання аб сваім выбары[6].*

Ёсць пэўная паралель паміж згвалтаваннем і абортам: і тое, і другое робяць больш моцныя за кошт слабейшых.

Аборт не прыносіць ацалення ахвяры згвалтавання. Прымяненне смяротнага пакарання да невінаватага дзіцяці замест сэксуальнага злачынцы не робіць нічога дрэннага гвалтаўніку і нічога добрага жанчыне.

Стварэнне другой ахвяры ніколі не змяншае шкоду для першай ахвяры.

# Частка 4

# Іншыя важныя пытанні



## ГЛАВА 14

# А ШТО НАКОНТ ПАКАЛЕЧАНЫХ АБО НЕЖАДАНЫХ ДЗЯЦЕЙ?

Некаторыя гавораць: "Дазваляць дзецям з разумовымі ці фізічнымі абмежаваннямі нараджацца, каб бессэнсоўна пакутваць – гэта жорстка". Але што самі так званыя "абмежаваныя" думаюць аб сваім жыцці? У пацыентаў з расшчапленнем пазваночніка спыталі, ці робіць такая паталогія іх жыццё бессэнсоўным, магчыма, варта было дазволіць ім памерці пасля нараджэння? "Усе адзінадушна далі пераканаўчы адказ. Безумоўна, не! Яны хочуць жыць! Па праўдзе кажучы, само пытанне яны палічылі бязглуздым"[1].

Аднойчы мне давялося пачуць, як адзін актывіст "за выбар" сказаў пра дзіцёнка з вельмі сур'ёзнымі адхіленнямі: "Хіба можам мы прымушаць жанчыну нараджаць у гэты свет монстра?" Нават проста ўжываючы такія словы мы пачынаем верыць у іх. Словам "гароднiна" таксама вельмі часта называюць гэтых гаротных людзей. Такая тэрміналогія робіць з іх не-людзей у нашых вачах, але гэта не перамяняе таго, кім яны з'яўляюцца.

Пабіты яблык – таксама яблык. Сляпы сабака – таксама сабака. Лядашчая жанчына – таксама жанчына. Пакалечанае дзіця – таксама дзіця. Чалавек не перастае быць чалавекам і яго каштоўнасць не змяншаецца ад таго, што ў яго ёсць недахопы.

Некаторыя дактары раяць перапыніць цяжарнасць, калі ў генетычнай гісторыі бацькоў ёсць рызыка анамаліі. Стандартнае даследаванне на магчымыя дэфекты робіцца пасродкам амніяцэнтэзу – пункцыі плоднага пузыра. Нацыянальны даклад жыццёвай статыстыкі ЗША паведамляе, што ў 2000 г. з тысячы жанчын 28,9 пакутвалі на ўскладненні ад амніо-

цэнтэзу – фактара рызыкі для прыблізна 3% жанчын[2]. Таксама паводле ацэнак Цэнтра па кантролю хвароб, паказальнік выкідкаў у выніку пункцыі плоднага пузыра, праведзенай на ранніх тэрмінах, вар'іруецца "паміж адным на 400 і адным на 200 працэдур". Тое ж даследаванне выявіла дзесяціразовае павышэнне рызыкі развіцця касалапасці ў дзяцей пасля ранніх амніоцэнтэзаў[3]. Іронія ў тым, што працэдура, створаная для выяўлення пашкоджанняў плода, сама з'яўляецца адчувальным фактарам фармавання гэтых пашкоджанняў[4].

Пункцыя плоднага пузыра часта праводзіцца для вызначэння сіндрому Даўна ў дзяцей, каб бацькі маглі прыняць вырашэнне аб аборце. Верагоднасць выкідку ад амніоцэнтэзу прыблізна такая ж, як верагоднасць сіндрому Даўна[5].

## Шызафрэнія грамадства

З аднаго боку, мы забяспечваем адмысловыя паркавачныя месцы і ліфты для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Мы пяшчотна кажам пра дзетак з расшчапленнем пазваночніка і сіндромам Даўна. Мы спансуем паралімпійскія гульні і шануем пераможцаў, распавядаючы пра радасць і натхненне, якое яны нам прыносяць. Але калі мы чуем, што жанчына носіць такое дзіця, мы кажам ёй: "Забі яго!"

Паказальна, што "ніколі не было аніводнай арганізацыі бацькоў, якія маюць дзяцей з запавольваннем ментальнага развіцця, якая б калі-небудзь падтрымлівала аборты"[6].

Дапусцім, вашае шасцігадовае дзіця аслепла, або стала спаралізаваным. Цяпер гэтае дзіця для вас сапраўдны цяжар. Выхоўваць яго дарага, нязручна і цяжка для вашага псіхічнага здароўя. Ці станеце вы забіваць гэтае дзіця? А калі б закон дазволіў вам яго забіць, вы б пайшлі на гэта? Калі не, то чаму?

Вы не сталі б забіваць вашае пакалечанае дзіця, *таму што вы ведаеце яго.* Але дзіця, якое вы яшчэ не трымалі на руках, чый плач яшчэ не чулі, не з'яўляецца менш каштоўным, а

яго страта не з'яўляецца меншай стратай. Дайце сабе шанец пазнаць вашае дзіця. Вы *палюбіце* яго!

А што наконт дзяцей з анэнцэфаліяй, у якіх няма паўнаразвітага мозгу? Дактары часта раяць бацькам зрабіць аборт, бо такія дзеці амаль адразу паміраюць. Але адна справа ведаць, што дзіця памрэ, і зусім іншая – самому адабраць жыццё ў гэтага дзіцяці. Многія сем'і перажылі каштоўнейшы досвед, калі давалі імя, насілі на руках і прывязваліся да свайго дзіця, хворага на анэнцэфалію. Потым, калі дзіця памірала, яны перажывалі такую ж жалобу, як ад натуральнай смерці члена іх сям'і. А гэта каласальна адрозніваецца ад пачуцця віны і хваравітай жалобы ў сітуацыі, калі дзіцяці адмаўляюць у ягоным месцы ў сям'і, і яго забіваюць.

Якасць грамадства ў значнай ступені вызначаецца тым, як яно ставіцца да сваіх найслабейшых членаў. Забойства невінаватага ніколі не зможа апраўдацца вызваленнем астатніх ад цяжару. Прынесці пакуты аднаму чалавеку, каб іншы пазбег пакутаў – гэта не вырашэнне праблемы. Калі мы абортам забіваем дзетак з абмежаванымі магчымасцямі, мы падвяргаем небяспецы ўсіх пакалечаных людзей.

## Цяжар нежаданасці

У Злучаных Штатах, паводле меркавання "Планаванага бацькоўства", непажаданыя дзеці "атрымліваюць ніжэйшыя адзнакі, асабліва ў мовах". Даследаванні сцвярджаюць, што ў падлеткавым узросце нежаданыя дзеці "пагаршаюць і без таго дрэнныя паказчыкі навучання" і "амаль не маюць шанцаў вылучыцца ва ўмовах павышаных школьных патрабаванняў". А "верагоднасць таго, што яны вырашаць атрымаць вышэйшую адукацыю, у два разы ніжэй у параўнанні з жаданымі дзецьмі"[7].

Я не стану спрачацца з гэтымі фактамі. Мы ўжо і так ведаем: вельмі важна, каб дзіця было жаданым. Аднак актывісты руху

"за выбар" выкарыстоўваюць дадзеныя такіх даследаванняў, каб апраўдаць аборты "нежаданых" дзяцей.

Ёсць нежаданыя цяжарнасці, але няма такой з'явы як нежаданае дзіця. Калі, магчыма, нехта і не хоча гэтых дзяцей, іншыя людзі адчайна хочуць іх.

Каля мільёна трохсот тысяч амерыканцаў хочуць усынавіць дзіця. Некаторыя хочуць настолькі моцна, што недахоп дзяцей для ўсынаўлення з'яўляецца прычынай глыбокіх дэпрэсій. Патрэба на дзяцей такая, што нават узнік чорны рынак па продажы немаўлят, дзе дзіця прадаюць за 50 тысяч даляраў. Прычым хочуць не толькі "нармальных" дзяцей, многія людзі шукаюць дзяцей з абмежаваннямі, у тым ліку сіндромам Даўна і расшчапленнем пазваночніка[8]. У Злучаным Каралеўстве каля чатырох тысяч дзяцей чакаюць усынаўлення штогод, хаця здаровых белых дзяцей, даступных для ўсынаўлення, літаральна адзінкі[9]. У многіх з гэтых дзяцей ёсць асаблівыя патрэбы, медычныя, эмацыйныя, ці асаблівасці паводзінаў і развіцця.

Многія дзеці, якіх спачатку мацеры не хацелі, становяцца жаданымі з цягам цяжарнасці і асабліва пасля нараджэння. На жаль, шмат дзяцей, якія сталі б жаданымі на шостым месяцы цяжарнасці, абартуюцца на трэцім месяцы.

Больш за тое, колькі жаданых дзяцей становяцца *нежаданымі* праз шэсць тыдняў пасля нараджэння, калі плачуць па начах? Дык ці павінна жаданне або нежаданне бацькоў вызначаць, ці заслугоўвае дзіця жыць? Калі гэта законная падстава да нараджэння, чаму б не распаўсюдзіць яе і пазней?

Праблема "нежаданасці" дзіцяці – гэта добры довад, каб жадаць дзяцей. Але гэта слабая падстава, каб іх забіваць.

Адзін з найбольш памылковых аспектаў аргументацыі "за выбар" – гэта спроба падвесці да ідэі, што само дзіця зацікаўлена ў аборце. Гэта настолькі абсурдна, што было б вартым смеху, калі б не было такім трагічным. Маленькую асобу разрываюць кавалак за кавалкам у яе ж інтарэсах?!! Падобным чынам рабаўладальнікі тлумачылі рабства, якое нібыта адпавядае інтарэсам чорных рабоў.

Людзі кажуць: "Я не магу захаваць гэтае дзіця, бо не магу даць яму добрае жыццё." А якое вырашэнне прапануецца, калі дзіцяці не могуць даць добрае жыцця? Забраць у яго і тое адзінае жыццё, якое яно мае.

## Кожнае дзіця – жаданае дзіця

"Нежаданае" – гэта апісанне не дзіцяці, а адносін дарослых да гэтага дзіцяці. Сапраўдная праблема – гэта не нежаданае дзіця, а дарослыя, якія не жадаюць.

"Жадаць" – гэта толькі адно чалавечае суб'ектыўнае і зменлівае пачуццё адносна іншага. "Нежаданае" дзіця – рэальная асоба безадносна да адчуванняў да яго. Калісьці ўжо каштоўнасць жанчыны вызначалася паводле таго, хацеў яе мужчына або не. Сёння жыццё дзіцяці вызначаецца па тым, хоча яго маці ці не. Абедзве гэтыя сітуацыі – трагічная несправядлівасць. Мы ўсе павінны пагадзіцца са слоганам "Планаванага бацькоўства": "Кожнае дзіця – жаданае дзіця!" Але правільны працяг гэтага:

"Кожнае дзіця – жаданае дзіця, таму... давайце змесцім кожнае дзіця ў той дом, дзе яно будзе жаданым. І давайце самі вучыцца жадаць дзетак больш."

## ГЛАВА 15

# ЦІ ПАПЯРЭДЖВАЕ АБОРТ ЖОРСТКАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА ДЗЯЦЕЙ?

Дзяўчына-падлетак нарадзіла дзіця ў матэлі. Яна і яе хлапец паклалі дзіця – яшчэ жывое – у пластыкавы пакет і выкінулі яго ў кантэйнер для смецця. Сямнаццацігадовая маці, якая хадзіла ў вечаровую школу, выкінула сваё немаўля ў раку, бо не знайшла няньку. Такіх гісторый процьма.

Даследаванне, праведзенае Нацыянальным таварыствам папярэджання жорсткага стаўлення да дзяцей, паказвае, што 7% дзяцей перанеслі факты сур'ёзнага фізічнага гвалту з боку бацькоў або апекуноў; 1% дзяцей перанеслі сэксуальны гвалт апекуноў або бацькоў, а яшчэ 3% дзяцей – з боку іншага сваяка; 11% дзяцей перанеслі сэксуальны гвалт з боку знаёмых людзей, але не сваякоў; 5% - перажылі сэксуальны гвалт ад незнаёмых людзей[1].

У 1973 г., калі ў Злучаных Штатах упершыню легалізавалі аборты, за год абылося прыкладна 167 тысяч выпадкаў жорстакага стаўлення да дзяцей[2]. Згодна з дадзенымі Міністэрства аховы здароўя ЗША за 2001 год прыблізна 903 тысячы дзяцей сталі ахвярамі жорстакага стаўлення, атрымліваецца за 28 гадоў гэты паказчык павялічыўся ў пяць разоў[3].

Гэтыя лічбы выглядаюць яшчэ больш драматычна, калі прыгадаць, што 45 мільёнаў амерыканскіх дзяцей, забітых хірургічным абортам, (і невядома колькі праз хімічны аборт) не лічацца ахвярамі жорсткага стаўлення да дзяцей. Пры гэтым, аборт з'яўляецца найбольш ранняй формай гвалту над дзецьмі і самай смяротнай. Аргумент, што аборт папярэджвае жорсткае стаўленне да дзіцяці, справядлівы ў той жа ступені, у якой забойства вашай жонкі з'яўляецца папярэджаннем жорсткага стаўлення да яе. Да мёртвых людзей немагчыма

ставіцца больш жорстка, але старацца прадухіліць жорсткае стаўленне забойствам – гэта нейкая вычварэнная логіка.

## Што паказваюць даследаванні

"З'яўленне большай колькасці нежаданых дзяцей павялічыць жорсткасць у дачыненні да іх," – гэта звычайны аргумент актывістаў "за выбар". Даследаванні, аднак, яго аспрэчваюць.

Эдвард Леноскі, прафесар універсітэта Паўднёвай Каліфорніі, правёў грунтоўнае вывучэнне 674 дзяцей, якія перажылі жорсткае стаўленне да сябе. Як высветлілася, 91% бацькоў прызналі, што яны жадалі з'яўлення дзяцей, да якіх потым жорстка ставіліся[4]. Аргумент актывістаў "за выбар" можа гучаць лагічна, але найбольш грунтоўнае з праведзеных на сённяшні дзень даследаванняў сведчыць пра адваротнае.

"Вынікі даследавання паказваюць, што жорсткасць да дзяцей часцей праяўляюць мацеры, якія раней рабілі аборт"[5]. Даследаванні прафесара Філіпа Нэя часткова тлумачаць гэта віной і прыгнечанасцю з-за аборту, якія перашкаджаюць маці наладзіць сувязь з будучымі дзецьмі[6]. Ён устанавіў, што аборт зніжае прыродную ўстойлівасць бацькоў негатыўным пачуццям, накіраваным на малых дзяцей[7].

Абіраючы аборт, тата і мама адкідваюць свой прыродны імпульс клопату пра бездапаможнае дзіця. Падаўленне гэтага абарончага інстынкту прыводзіць да праяўлення большай раз'юшанасці ў дачыненні да бездапаможнага нованароджанага, плачу немаўля ці дрэнных паводзінаў дзіцяці[8].

Падыход, які прыводзіць да аборту, акурат той жа самы, які прыводзіць і да жорсткага стаўлення да дзяцей. Больш за тое, калі маці і не зрабіла аборт, яна можа, гледзячы на сваё складанае трохгадовае дзіця, думаць: "А ў мяне было права абартаваць цябе!" Дзіця вінаватае ёй ўсё; яна ж нічога не павінна

дзіцяці. Гэта выклікае абурэнне любымі патрэбамі, для якіх неабходна ахвяра з боку бацькоў.

У Англіі і Уэльсе, у сярэднім, ад рук бацькоў дзіця гіне кожныя дзесяць дзён[9]. З 5000 дзяцей, якіх штогод забіваюць у ЗША (без уліку абортаў), 95% гінуць ад рук аднаго ці абодвух бацькоў[10]. Уяўленне, што дзеці з'яўляюцца ўласнасцю бацькоў, становіцца ўсё больш распаўсюджаным. Дарослыя думаюць, што маюць такое ж права распараджацца сваімі дзецьмі, якое, паводле перакананняў грамадства, яны маюць над ненароджанымі дзецьмі. Калі ўжо светапогляд жорсткага стаўлення да дзяцей захапіў грамадства, ён не павінны абмяжоўвацца нейкай адной узроставай групай. Калі ненароджаныя дзеці ў небяспецы, іншыя дзеці – таксама ў небяспецы.

Аўстралійскі філосаф Пітэр Сінгер піша:

*"Мы не маем дакладнай мяжы паміж нованароджаным дзіцем, які не з'яўляецца асобай у строга этычным сэнсе, і старэйшым дзіцём, які ўжо з'яўляецца. У нашай кнізе "Ці павінна дзіця жыць?" мы з маёй калегай Хэльгай Кюхз прапануем, каб дзіця атрымлівала тыя ж правы на жыццё, што і астатнія людзі толькі пасля тэрміну ў 28 дзён пасля нараджэння"* [11].

Дзецям даюць права на жыццё на дваццаць восьмы дзень пасля нараджэння? А чаму не пачакаць шэсць месяцаў? Ці шэсць год? Хіба не з'яўляецца забойства пяці-, дзесяці-, пятнаццацігадовага дзіцяці проста чарговым пасляродавым абортам? Як паказвае прафесар Сінгер, аднойчы ўстанавіўшы, што забіваць асобу – гэта нармалёва, мы пакідаем дзверы шырока адчыненымі для рознага кшталту забойстваў: ад забойства "ў пэўным узросце" да забойства "па нейкай прычыне".

Вырашэнне праблемы жорсткага абыходжання з дзецьмі па-за ўлоннем у тым, каб не абыходзіцца з імі жорстка ва ўлонні. Вырашэнне не ў тым, каб абысціся з імі жорстка *раней*. Вырашэнне ў тым, каб не рабіць гэтага ўвогуле.

## ГЛАВА 16

# АСАБІСТАЯ ПАЗІЦЫЯ: СУПРАЦЬ АБОРТАЎ, АЛЕ "ЗА ВЫБАР"?

Шмат хто кажа: "Я не падтрымліваю аборты, але я – "за выбар". А што б вы сказалі чалавеку, які сцвярджае: "Я не за згвалтаванне, я – проста за свабодны выбар адносна згвалтавання"? Хіба гэта значыць, што гвалт нікога не раніць, і яго можна апраўдаць? Вы б сказалі: "Быць "за выбар" у пытанні гвалту, значыць быць за гвалт".

Такім жа самым чынам быць "за выбар" у пытанні абортаў – значыць быць за аборты.

На першы погляд, слоган налепкі на бампер выглядае разумным: "Супраць аборту? Дык я і не рабіў!" Гэта логіка добра стасуецца з палётамі на самалётах, гульнёй у футбол або з'яданнем піцы... Але не са згвалтаваннем, катаваннем, крадзяжом людзей або забойствам.

## Сярэдняя пазіцыя?

Некаторыя людзі – супраць аборту, пры гэтым яны вераць, што іншыя маюць права выбіраць. Свайго роду кампраміс паміж пазіцый "за аборты" і пазіцыяй "за жыццё". Але гэта не так. Людзі "за выбар" галасуюць гэтаксама, як і людзі "за аборты". Забітаму дзіцяці няма аніякай розніцы, хто адмовіўся абараняць яго – людзі, якія "за аборты", або людзі з памяркоўнай пазіцыяй "за выбар" адносна абортаў.

Адзіная добрая прычына выступаць супраць абортаў, прымушае нас таксама выступаць і супраць таго, каб аборты рабілі іншыя людзі, і гэтая прычына – забойства дзіцяці. Асабіста быць супраць абортаў, але вітаць права іншых на аборт – пазіцыя, якая пярэчыць сама сабе. Гэта тое ж самае, як казаць: "Асабіста

я супраць жорсткага стаўлення да дзяцей, але я абараняю права майго суседа жорстка абыходзіцца з дзецьмі, калі гэта ягоны выбар". Ці: "Я асабіста супраць рабаўладальніцтва, але, калі іншы хоча валодаць рабамі, гэта – не мая справа". Або: "Асабіста я супраць збіцця жонкі, але я не хачу навязваць свае маральныя прынцыпы іншым, таму я за выбар у пытанні збіцця жонак".

Аднойчы на адным ток-шоу на радыё апанентка сказала мне, што яе крыўдзіць, калі людзі называюць яе пазіцыю "за аборт", а не "за выбар". Я запытаўся ў яе: "А чаму вы не хочаце, каб вашую пазіцыю называлі "за аборты"? Што не так з абортамі?" Яна адказала: "Аборты – жорсткія. Не падобна, каб нехта сапраўды быў за іх". Тады я сказаў: "Я не разумею, што робіць іх жорсткімі?" Раптоўна згубіўшы цярпенне, яна адказала мне: "Ведаеце, гэта жорстка – забіваць сваё дзіця!"

Праз секунду пасля гэтых слоў, жанчына зразумела, што падлавіла сама сябе, але было ўжо занадта позна. У момант, калі яна згубіла пільнасць, жанчына раскрыла тое, што ведала; тое, што ведае кожны, хто наважваецца прызнацца сабе ў гэтым: аборты цяжкія па той жа прычыне, па якой яны няправільныя: таму што гэта – забойства дзіця.

Не існуе прычыны дастаткова пераканаўчай, каб забіваць дзіця.

## ГЛАВА 17

# ШТО НАКОНТ УСЫНАЎЛЕННЯ?

Вялікая іронія руху "за выбар" у тым, што ён культывуе ідэю, што ў жанчыны няма выбару, акрамя аборту. Рух "за выбар" больш справядліва было б называць рух "ніякага выбару акрамя аборту". Шмат жанчын могуць пацвердзіць, што для іх "за выбар", насамрэч, значыць "без выбару".

Бацькі, маці, хлопцы, мужы, настаўнікі, школьныя псіхолагі, дактары, медсёстры, равеснікі і сродкі масавай інфармацыі звычайна цiснуць на цяжарную жанчыну, каб яна зрабіла выбар, які яе сумленне лічыць няправільным, выбар, які ў большай ступені выбар іншых людзей, а не яе. (Але дзе будуць усе яны, калі яна зразумее, што ж яна нарабіла?)

Ці сапраўды жанчыны хочуць абортаў? Фрэдэрыка Мэцьюс-Грын, былая прэзідэнт "Феміністак за жыццё", кажа: "Ніхто не хоча аборту, як хочуць морожанае або Porsche. Жанчына хоча аборт, як жывела, патрапіўшая ў пастку, хоча адгрызці сабе лапу. Аборт – гэта трагічная спроба збегчы з адчайнай сітуацыі праз акт жорсткасці і самастраты"[1].

Аборт не столькі свабодны выбар, колькі апошняе выйсце. Большасць жанчын абралі б не рабіць аборт, калі б адчувалі, што атрымаюць патрэбную эмацыйную і фінансавую падтрымку.

Прыблізна дзве трацiны жанчын, якія прайшлі праз аборт, апісалі сябе, як "прымушаных да аборту сваімі асаблівымі абставінамі. Больш за 84% сцвярджалі, што пакінулі б дзіця пры лепшых абставінах"[2].

# Альтэрнатыва

У грамадстве, якое сапраўды цэніць выбар, мы павінны паказаць жанчыне ўсе магчымыя варыянты выбару, у тым ліку ўсынаўленне. Сябар распавёў нам: "Калі я быў кансультантам у клініцы абортаў, я абсалютна не меў інфармацыі пра альтэрнатывы аборту. Я ніколі не раіў аддаць дзіця на ўсынаўленне, або пакінуць яго ў сябе. Я абсалютна нічога не ведаў з медычных фактаў, у тым ліку інфармацыю пра развіццё плода. Я не праходзіў нейкага азнаямлення з фактамі – мая праца заключалася ў тым, каб проста пераканацца, што жанчына больш-менш нармальна перанясе аборт".

З такімі "кансультацыямі" колькі жанчын абяруць што-небудзь акрамя аборту? Былыя ўладальнікі і працаўнікі абартарыяў казалі, што іхняй працай было "прадаваць аборты" цяжарным жанчынам. Некаторыя клінікі нават наймалі прафесіянальных кансультантаў па маркетынгу, каб навучыць свой персанал продажу абортаў[3].

Усынаўленне – гэта станоўчая альтэрнатыва аборту, якая дазваляе не прымаць адказнасці за выхаванне дзіцяці, пры гэтым захоўвае жыццё і робіць адну сям'ю шчаслівай.

Даследаванне цэнтраў клопату пра цяжарных паказвае, што эмацыйнае непрыняцце ўсынаўлення – найбольш распаўсюджаная перашкода, з якой сутыкаюцца жанчыны перад абортам[4]. Прычына, чаму ўсынаўленне можа прыносіць боль, тая ж самая, якая робіць аборт знішчальным для жанчыны – гэта вырашэнне лёсу жывога дзіцяці.

У літаратуры руху "за выбар" усынаўленне часта паказваецца негатыўна. Абаронцы руху "за выбар" Кэраль Андэрсан і Лі Кэмпбэл так выказваюцца пра ўсынаўленне:

"Непатрэбнае раздзяленне маці і дзіця – жорсткае, але, нажаль, звычайнае пакаранне працягласцю ў жыццё"[5].

Гаворачы пра жорсткасць усынаўлення, яны забываюць сказаць пра пачуццё віны працягласцю ў жыццё, якое

з'яўляецца, калі жанчына разумее, што забіла сваё ж дзіця. Усынаўленне наўрад ці можна назваць пакараннем для жанчыны, якая адчувае, што не здолее выгадаваць дзіця. Хоць гэта і можа быць цяжкім, гэта – нябёсамі пасланая альтэрнатыва.

Мы павінны паклапаціцца, каб і жанчыны, і дзеці ведалі пра ўсынаўленне.

## Аборт абкрадае сем'і, якія чакаюць на ўсынаўленне

Вынашваючы дзіця, маладая жанчына прымае на сябе адказнасць за свой выбар. Яна расце і сталее. Яна з гонарам і задавальненнем азіраецца назад, бо зрабіла правільны выбар, дорачы свайму дзіцяці і жыццё, і добрую сям'ю. Канечне, усынаўленне – гэта толькі адна альтэрнатыва. Маладая жанчына можа вырашыць пакінуць дзіця і гадаваць яго самой. Любы з гэтых варыянтаў можа быць правільным.

"Якой жа маці я буду, калі аддам дзіця на ўсынаўленне?" – запытваюцца некаторыя. Іронія ў тым, што маці не аддае дзіця на ўсынаўленне, бо гэтае дзіця занадта каштоўнае, замест гэтага забівае яго. Пытанне, якое варта задаць гэтай жанчыне, не "Як я магу аддаць сваё дзіця на ўсынаўленне?", а "Як я магу забіць сваё дзіця абортам?" Нават калі яна не можа сама паклапаціцца пра сваё дзіця, як можна не бачыць варыянта дазволіць іншым людзям любіць і клапаціцца пра гэтае дзіця? На жаль, гэта не так проста.

Жанчына хоча, каб яе складаная сітуацыя скончылася, а ўсынаўленне складае ўражанне нявырашанасці "з-за няўпэўненасці і віны, якія яна адчувае і да сябе, і да дзіцяці"[6]. Яна не проста не адчувае сябе мамай, але яшчэ і дрэннай мамай, якая аддала сваё дзіця незнаёмым. Яна непакоіцца, што можа кінуць сваё дзіця, або што да яго будуць ставіцца жорстка. Гэтыя

развагі будуюцца на ідэі, вельмі жаданай для жанчыны, што пры аборце дзіцяці проста не будзе і яна проста не будзе маці. Па праўдзе, у яе няма выбару, ці станавіцца маці, ці рэальнае яе дзіця – абодва факты безальтэрнатыўныя. Яе дзіця – рэальнае, і таму яна – маці. Адзінае пытанне: што яна, маці, зробіць са сваім дзіцем?

З-за таго, што яна яшчэ не прывязалася да дзіцяці, аборт можа падавацца прасцейшым вырашэннем, у той час, як разлучыцца з дзіцем пасля нараджэння можа быць эмацыйна складана. Але дзіця існуе незалежна, ці ёсць эмацыйная сувязь з ім. У жанчыны ёсць тры выбары: захаваць дзіця і выхаваць яго, захаваць дзіця і дазволіць іншай сям'і выхаваць яго або забіць яго. Хаця часта аборт выглядае самым прывабным варыянтам, ён, на жаль, і самы дэструктыўны.

Мы павінны дапамагчы маладой жанчыне пабачыць гадаванне дзіцяці, усынаўленне і аборт такімі, якімі яны насамрэч з'яўляюцца. Мы павінны паказваць усынаўленне, як смелы выбар, які дасць шанец дзіцяці і сям'і.

Цяжарная дзяўчына-падлетак, якую мы прытулілі ў сваім доме, зрабіла на той момант ужо два аборты. Але жывучы ў нас, яна нарадзіла дзіця і аддала яго на ўсынаўленне. Гэта не было лёгка, але гэтая цудоўная жанчына праз гады сказала мне: "Азіраючыся на тых трох дзетак, якія зараз не са мной, я маю вельмі розныя адчуванні. Двое, якіх я абартавала, напаўняюць мяне жалобай і шкадаваннем. Але калі я думаю пра тое дзіця, якое я аддала на ўсынаўленне, я напаўняюся радасцю бо ведаю, яго выхаваюць у сям'і, якая чакала яго".

Хрысціянскія супольнасці павінны станоўча ставіцца да ўсынаўлення і выказваць свой клопат да жанчын, якія аддалі сваіх дзяцей на ўсынаўленне. Мы павінны публічна шанаваць прыёмных бацькоў і дабраслаўляць усынаўлёных дзетак. Варта зрабіць заўважнымі цудоўныя матэрыялы па ўсынаўленню і святкаваць усынаўленні ў нашых цэрквах. Толькі такім чынам мы можам дапамагчы маладым жанчынам зразумець,

што ўсынаўленне – гэта смелы выбар, за які і бацькі, і дзіця будуць глыбока ўдзячныя.

Пазіцыя "за выбар", у рэшце рэшт, азначае: ніякага выбару ці бедны выбар. А ўсынаўленне прапануе мудры спачувальны выбар, які найбольш адпавядае інтарэсам *усіх*.

## Частка 5

# Духоўныя перспектывы і магчымасці



# ГЛАВА 18

# ЦІ МОЖА БОГ ПРАБАЧЫЦЬ АБОРТЫ?

Мільёны жанчын і мужчын у грамадстве і ў цэрквах пакутуюць ад віны за аборт.

Калі вы – жанчына, якая зрабіла аборт, або дарадца той, якая прайшла праз гэта, тады гэты раздзел для вас. Калі вы – мужчына, які меў дачыненне да вырашэння аб аборце, няважна каго яно тычылася – вашай дзяўчыны, жонкі, дачкі або кагосьці іншага – гэты раздзел і для вас таксама.

Немагчыма зменшыць пачуццё віны, ігнаруючы прычыну віны. Іншыя могуць казаць: "Тут няма з-за чаго адчуваць віну!", але вы ведаеце лепш. Ігнаруючы рэчаіснасць нельга пазбегнуць пачуцця віны. Адмаўленне прыводзіць вас да эмацыйнага краху кожны раз, калі нешта будзе нагадваць вам пра дзіця, якое вы калісьці насілі. Вам неабходна раз і назаўсёды вырашыць праблему віны, засноўваючыся на рэчаіснасці, а не на падмане.

Такое вырашэнне прапануе Біблія, таму прывяду некаторыя цытаты з яе. Папрасіце каго-небудзь з вашай царквы, кіраўніка жаночай групы або проста знаёмага хрысціяніна дапамагчы вам зразумець іх.

## Праца Хрыста

Добрая навіна ў тым, што Бог любіць вас і хоча прабачыць вам аборт, не зважаючы, разумелі вы, што робіце, або – не. Але перад тым, як добрая навіна можа быць правільна ўспрынята, нам неабходна даведацца дрэнную навіну. Дрэнная навіна ў тым, што ёсць сапраўдная маральная віна і кожны з нас вінаваты ў мностве маральных злачынстваў супраць Бога, сярод якіх аборт – толькі адно з многіх: "...бо

ўсе саграшылі і пазбаўлены славы Божае" (Пасланне да Рымлянаў 3:23)*.

Грэх азначае несупадзенне са святымі Божымі стандартамі. Ён раздзяляе нас з Богам (Ісаі 59:2). Грэх уводзіць нас у зман, прымушаючы думаць, што дрэннае – правільна, а правільнае – дрэнна (Прыпавесці 14:12). "Бо заплата за грэх — смерць, а дар Божы —жыццё вечнае ў Хрысце Ісусе, Госпадзе нашым" (Пасланне да Рымлянаў 6:23).

Ісус Хрыстос – Сын Божы – палюбіў нас настолькі, што стаў чалавекам, каб збавіць нас ад праблемы грэху (Евангелле паводле Яна 3:16). Ён спадобіўся нам у нашай слабасці, толькі што не быў сапсаваны грэхам (Пасланне да Жыдоў 2:17, 18; 4:15, 16). Ісус памёр на крыжы, як адзіны годны таго, каб заплаціць плату за нашыя грахі, якая патрабавалася Божай Святасцю (Другое пасланне да Карынфянаў 5:21). Ён паўстаў з мёртвых, перамогшы грэх і падпарадкаваўшы смерць (Першае пасланне да Карынфянаў 15:3, 4, 54-57).

Калі Хрыстос паміраў за нас на крыжы, ён сказаў: "Збылося!" (Евангелле паводле Яна 19:30). Грэцкае слова, перакладзенае як "збылося", пісалася на пазыковай распісцы, калі тая скасоўвалася. Яно азначала "выплачана цалкам". Хрыстос памёр, каб цалкам выплаціць нашую пазыку.

## Поўнае прабачэнне

Дзякуючы таму, што Хрыстос на крыжы дзейнічаў за нас, Бог бясплатна прапаноўвае нам прабачэнне. Вось толькі некалькі прыкладаў таго, што Ён прапаноўвае:

*Не водле грахоў нашых нам Ён дае*
*І не аплачвае па правіннасцям нашым...*
*Як далёкі ад захаду ўсход,*
*Так далёка Ён нашыя праступкі ад нас аддаліў.*

* Тут і далей цытаты Новага Запавету і Псальмаў прыводзяцца паводле перaклада Л.Дзекуць-Малея.

*Як літуецца бацька над дзецьмі,*
*гэтак Госпад літуецца над тымі,*
*хто баіцца Яго... (Псальм 102:10,12,13)*
*Калі вызнаём грахі нашыя, дык Ён - верны і справядлівы, каб дараваць нам грахі нашыя і ачысціць нас ад усякае няпраўды. (Першае пасланне Яна 1:9).*
*Дык вось няма цяпер ніякага асуджэння тым, што ў Хрысце Ісусе.... (Пасланне да Рымлянаў 8:1)*

## Дар, які немагчыма заслужыць

Збаўленне – гэта дар: "Бо ласкай вы выбаўлены праз веру; і гэта не ад вас — Божы дар: не ад дзел, каб ніхто не хваліўся" (Пасланне да Эфесцаў 2:8,9). Гэты падарунак немагчыма заслужыць, зарабіць або дасягнуць. Ён не залежыць ад нашых вартасцяў ці намаганняў, але толькі ад ахвяры Хрыста за нас.

Бог прапануе нам дар прабачэння і вечнага жыцця, але яно не становіцца нашым аўтаматычна. Каб атрымаць гэты дар, мы павінны прыняць яго.

Вы можаце падумаць: "Але ж я не заслугоўваю прабачэння пасля ўсяго, што я зрабіла!" І гэта сапраўды так. Ніхто з нас не заслугоўвае прабачэнне. Калі б мы яго заслугоўвалі, мы б не мелі ў ім патрэбы. У гэтым сэнс ласкі. Хрыстос атрымаў на крыжы тое, што заслугоўвалі мы, дзякуючы гэтаму мы можам атрымаць тое, што не заслугоўваем, – чыстую старонку, новы старт.

Прабачаныя аднойчы, мы можам чакаць, што правядзем вечнасць разам са Хрыстом і нашай духоўнай сям'ёй (Евангелле паводле Яна 14:1-3; Адкрыццё 20:11-22:16). Мы можам чакаць яднання на нябёсах з тымі, каго мы любім і хто пакрыты крывёю Хрыста (Першае пасланне да Фесаланікійцаў 4:13-18).

## Не трэба цягнуць мінулыя грэхі за сабой

Распусная жанчына аблівала ногі Хрыста слязьмі, цалавала іх і выцірала сваімі валасамі. Хрыстос сказаў чалавеку, які, стоячы побач, асуджаў: "Дзеля гэтага кажу табе: даруюцца многія грахі яе за тое, што яна многа ўзлюбіла" (Евангелле паводле Лукі 7:47). Ісус прапануе такое ж прабачэнне і кожнаму з нас.

Бог не хоча, каб вы ішлі па жыцці, караючы сябе за аборт ці нешта іншае, што вы зрабілі няправільна. Наша частка – гэта прыняць выкупленне Хрыста, а не паўтарыць яго. Ісус сказаў жанчыне, якая вяла амаральны лад жыцця: "Адпускаюцца табе грахі... вера твая спасла цябе; ідзі з мірам" (Евангелле паводле Лукі 7:48,50). Жанчына, адрынутая грамадствам, прыйшла да Ісуса і ён сустрэў яе са спачуваннем і прабачэннем.

Не важна, што вы зрабілі – няма грэху большага за ласку Бога. Ён бачыў нас у нашыя горшыя моманты і ўсё адно любіць нас. І няма іншай свабоды, якая магла б параўнацца са свабодай прабачэння.

Магчыма, вы імгненна адчуеце сябе ачышчаным, калі прызнаецеся ў сваіх грэхах, або вам можа спатрэбіцца час, каб адчуць гэта. У любым выпадку – вы прабачаны. Вам варта паспрабаваць забыцца на тое, што засталося ў мінулым, і рухацца ў радасную будучыню, якая стала магчымай дзякуючы Хрысту (Пасланне да Філіпянаў 3:13,14). А калі мы зноў пачалі адчуваць непрабачэнне, значыць час вярнуцца да Бібліі і нагадаць сабе і адно аднаму пра Божае прабачэнне.

## Правільны выбар як наступства прабачэння

Многія жанчыны, якія прайшлі праз аборт, нясуць у сабе зразумелую горыч да тых мужчын, якія скарысталіся імі, да

бацькоў, якія ціснулі на іх, і да тых, хто падштурхнуў іх на шлях забойства дзіцяці. Бог чакае ад нас, што мы не толькі прымем прабачэнне ад Яго, але і распаўсюдзім гэтае прабачэнне на іншых (Евангелле паводле Мацвея 6:14,15).

Вам варта стаць часткай тэрапеўтычнай супольнасці, сям'і хрысціян, якая называецца царквой. (Калі вы ўжо частка царквы – падзяліцеся сваім досведам аборту с кімсьці, здольным даць вам патрэбную дапамогу.) Вы можаце адчуваць сябе засмучаным з-за вашага хрысціянства. Але не варта. Царква, цэнтрам якой сапраўды з'яўляецца Хрыстос, – гэта не выставачная заля для святых, але лякарня для грэшнікаў. Там вас не стануць асуджаць і абвінавачваць за грэхі, якія Хрыстос ужо дараваў. Людзі ў царкве, якія навокал вас, настолькі ж людзі наколькі і вы, і яны такія ж недасканалыя. У большасці цэркваў людзі не самаправедныя. А тых, хто такімі з'яўляецца, можна толькі пашкадаваць, бо яны не зразумелі Божай ласкі. Добрая царква будзе вучыць ісцінам з Бібліі і забяспечыць вас любоўю, прыняццем і падтрымкай.

Правільным крокам для вас было б знайсці жанчын, якія прайшлі праз нежаданыя цяжарнасці. Бог можа выкарыстаць ваш досвед, каб дапамагаць іншым і дзяліцца з імі любоўю Бога. У нас з жонкай ёсць некалькі сяброў, якія раней зрабілі аборты. Праз свае клапатлівыя намаганні па абароне жыцця яны далі многім жанчынам дапамогу, якую хацелі б у свой час атрымаць самі. Распавядаючы свае гісторыі, яны не толькі выратавалі мноства дзіцячых жыццяў і зберагалі маці ад болю аборту, але яшчэ і самі ацаліліся ад старых ран. Тое ж можа адбыцца і з вамі.

## ГЛАВА 19

# ПАЗІЦЫЯ "ЗА ЖЫЦЦЁ": ПЕРАШКОДА "ВЯЛІКАМУ ДАРУЧЭННЮ" АБО ЯГО ЧАСТКА?

Многія "добрыя" хрысціяне вераць, што цэрквы не павінны займацца праблемай абортаў. Некаторыя кажуць, што размаўляючы пра аборты, мы выклікаем ў людзей пачуццё віны. Але казаць пра аборт неабходна, каб *папярэдзіць* і яго, і тое пачуццё віны, якое ён прыносіць, а таксама каб прапанаваць дапамогу і надзею тым, хто зараз пакутуе ад асэнсавання сваёй віны і мае патрэбу ў вызваленні. Тое, што ў нашых цэрквах ёсць людзі, якія прайшлі праз аборт, – вельмі слабая прычына, каб маўчаць пра гэтую праблему. Наадварот, гэта лепшы аргумент, каб надаваць больш увагі пытанню абортаў і прапаноўваць людзям іншую будучыню, а таксама такую дапамогу і падтрымку, на якія мы толькі здольныя.

Адзін семінарыст з маёй царквы аднойчы сказаў мне фразу, якую я часта чую ў той ці іншай форме. Ён сказаў: "Пытанні накшталт абортаў толькі аддцягваюць увагу ад галоўнай справы".

Я запытаў: "А што з'яўляецца галоўнай справай?"

"Вялікае даручэнне, – адказаў хлапец. – Набываць людзей для Хрыста. Вось што мы павінны рабіць. А ўсё астатняе адцягвае ўвагу".

Ён меў на ўвазе словы Хрыста, запісаныя ў Мацвея 28:19, 20: "Дык ідзеце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца і Сына і Святога Духа, вучачы іх выконваць усё, што Я запаведаў вам".

Дык ці меў рацыю гэты хлапец? Дзеянні ў абарону жыцця – гэта адцягванне ўвагі ад "вялікага даручэння"... або частка яго?

# Чалавек, якога звалі Уільям

Два стагоддзі таму жыў англічанін Уільям, знакаміты змагар супраць рабства, які байкатаваў цукар з Заходняй Індыі, паколькі гэта быў прадукт рабства. Уільям адчуў, што Бог хоча, каб ён паехаў у Індыю, дзе, як ён з жахам даведаўся, вялікая колькасць індусаў пакідалі сваіх дзетак-немаўлят на смерць. Таксама яны пакідалі слабых, хворых і пракажоных. Брытанскі ўрад глядзеў на гэта скрозь пальцы, бо не хацеў умешвацца ў культуру або рэлігію, але Уільям адчуў, што вымушаны ўмяшацца, бо гінулі людзі.

Аднойчы Уільям пабачыў звычай, які завецца *саці*, калі ўдава жывою спальвалася на пахавальным вогнішчы яе памерлага мужа. Пабачыўшы адну такую смерць, ён апынуўся перад групай людзей, якія сабраліся, каб спаліць жанчыну, і пачаў казаць, што гэты звычай няправільны. Пазней ён узначаліў групу місіянераў, якая паўстала супраць гэтага. Таксама ён пачаў праводзіць публічныя дэбаты наконт гэтага звычаю, каб паказаць, як Бог глядзіць на гэтую сітуацыю.

Раніцай у нядзелю 6 снежня 1829 г., пасля некалькіх гадоў змагання, Уільям атрымаў афіцыйны дэкрэт, які забараняў спальванне жонак. У гэты дзень ён павінны быў прапаведваць у царкве, але не стаў. Замест гэтага Уільям цэлы дзень прысвяціў таму, каб перакласці гэта дэкрэт на бенгальскую мову, бо ён ведаў, што ў гэты момант некаторыя жыцці вісяць на валаску.

Некаторыя крытыкавалі Уільяма за ягоную маральную і палітычную дзейнасць. Яны казалі: "Ты тут не для гэтага. Ты пакліканы не для гэтага. Сканцэнтруйся на галоўным! Проста прапаведуй Евангелле і маліся!"

Хто гэты грамадскі актывіст, якога так турбавалі маральнасць, законы і неабходнасць абараніць чалавечыя жыцці? Гэта быў Уільям Кэрэй, вядомы сёння як "бацька сучасных місій". Калі мы думаем пра "вялікае даручэнне" і сучасны місіянерскі рух, ніякае іншае імя не кідаецца ў вочы настолькі, як ягонае.

Кэрэй выправіўся ў Індыю, каб здабываць людзей для Хрыста і вучыць іх не праз расповед Евангелля, але праз жыццё паводле Евангелля. А яно ўключае і ўмяшальніцтва, дзеля выратавання жыцця, і працу над тым, каб перамяняць грамадскае меркаванне і кепскія законы.

## Сляды, па якіх трэба ісці

Джон Уэслі актыўна выступаў супраць рабства. Амерыканец Чарльз Фінэй, адыгрываючы галоўную ролю ў працы нелегальнай "Падпольнай чыгункі", выратоўваў жыцці мноства рабоў, аднак цярпеў крытыку ад многіх хрысціян за сваё грамадзянскае непаслухменства. Дуайт Мудзі адчыніў дамы для бедных дзяўчын, каб выратаваць іх ад эксплуатацыі. Чарльз Спэржэн будаваў прытулкі, каб клапаціцца пра састарэлых жанчын і зберагчы сірот ад жыцця на вуліцах Лондана. Эмі Карміхэль заступалася за індыйскіх дзяўчын, якіх сэксуальна эксплуатавалі, каб выратаваць іх ад храмавай прастытуцыі. Яна пабудавала для іх дамы, школу і лякарню.

Усе гэтыя хрысціяне вядомыя як місіянеры і евангелісты, то бок як людзі, якія клапаціліся пра выкананне "вялікага даручэння". Разам з тым, мы рэдка звяртаем увагу на іх радыкальную прысвечанасць у справе асабістай і грамадскай абароны слабых, бедных і прыгнечаных.

Можа іхні евангелізм быў эфектыўным, бо яны жылі ў адпаведнасці з Евангеллем, якое прапаведвалі? Няма ніякага канфлікту паміж Добрай весткай, сацыяльным клопатам і асабістым заступніцтвам за людзей у патрэбе.

## Частка "галоўнай справы"

Мы павінны намагацца выратаваць чалавечыя жыцці ўжо па той простай прычыне, што так кажа Біблія, па якой штотыдзень вучаць у нашых цэрквах:

*“Выратоўвай таго, хто ідзе да смерці...” (Прыпавесці 24:11)*
*“Вядзеце справу ўбогіх і сіротаў; нешчасцівым і бедным акажыце справядлівасць”. (Псальм 81:3)*
*“...любі свайго бліжняга як самога сябе”. (Мацф. 19:19)*

Божыя людзі асабліва павінны былі клапаціцца пра жанчын, якія засталіся без мужоў і дзяцей, якія засталіся без бацькі. (Якуба 1:27). Хто больш падыходзіць пад гэтае апісанне, чым незамужняя жанчына і яе ненароджанае дзіця?

У Евангеллі паводле Лукі 10:25 мы чытаем пра “знаўцу закона”, які запытваўся: “Што я павінны рабіць, каб атрымаць у спадчыну вечнае жыццё?” Ісус адказаў яму: “Любі Госпада Бога твайго.... і любі бліжняга свайго як самога сябе” (верш 27). Хрыстос назваў любоў да Госпада першым найважнейшым запаветам, а любоў да бліжняга – другім (Мацф. 22:37-39). Таму “вялікае даручэнне”, само па сабе, не з’яўляецца найбольшым запаветам; наадварот, гэта частка любові да Бога і любові да бліжняга.

Нішто іншае так не расчыняе дзверы для евангелля, як служэнні, скіраваныя на патрэбы людзей. Для прыкладу, удзел у царкоўным праекце, мэтай якога з’яўляецца практычная і эмацыйная падтрымка самотных бацькоў, можа стварыць магчымасці, каб падзяліцца Добрай весткай. Якія б патрэбы людзей мы не задавальнялі, евангелле становіцца натуральным і вартым даверу.

## Тры погляды на “вялікае даручэнне”

Неабходна памятаць пра тры рэчы, каб зразумець суадносіны паміж намаганнямі па абароне жыцця і “вялікім даручэннем”.

**Па-першае,** “вялікае даручэнне” – цэнтральнае прыказанне, але Ісус азначыў іншае прыказанне як найбольшае. “Вялікае даручэнне” ўсяго толькі працяг прыказання любіць Бога і бліжніх.

